Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 СТУДЗЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК № 10 (28374)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«Хачу «праверыць» унукаў»

СТАР. 5

Як Месяц уплывае на ўраджай

СТАР. 8-9

Курортны раман Янкі Купалы

СТАР. 12

НА БЕРАГАХ СІНЕЮЧАГА НІЛА

Візіты кіраўніка Беларусі ў Егіпет і Судан суправаджаюцца правядзеннем двухбаковых дзелавых форумаў

Гэтымі днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з афіцыйнымі візітамі на Афрыканскім кантыненце. Егіпет і Судан выбраны ў якасці мэт паездкі беларускага лідара зусім не выпадкова: у гэтых краінах мы маем стратэгічныя інтарэсы. Егіпет традыцыйна з'яўляецца самым праверaным і пастаянным партнёрам Беларусі ў Афрыцы. Судан, як і Егіпет, — дзяржава з вялікай колькасцю насельніцтва і блізкая для еўрапейскіх транзітных магістраляў. Абедзве краіны могуць стаць значнымі рынкамі збыту для нашай прадукцыі, а таксама пляцоўкамі для стварэння сумесных прадпрыемстваў.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Абдэль ФАТАХ АЛЬ-СІСІ падчас наведвання выставы беларускай тэхнікі.

ЮШКА НА МАРОЗЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У самы разгар Каляд у Магілёве ўжо не першы раз праходзіць конкурс па прыгатаванні юшкі. Сёлета ў духмяных спаборніцтвах, якія разгарнуліся ў Пячэрскім лесапарку ў мінулую суботу, удзельнічалі 11 арганізацый і прадпрыемстваў горада. Трэба было не толькі прыгатаваць смачную рыбную страву, але і «абараніць» яе перад журы і гледачамі. А пакаштаваць юшку маглі ўсе ахвотныя. Юным дэгустатарам Антону ІСМАІЛАВУ і Уладзіміру КУЛЯГІНУ *(на фота)* страва прыйшлася даспадобы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей БАРЫСЕВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама:

«Спажывецкі рынак сталіцы характарызуецца шырокай таварнай насычанасцю і стабільнай сітуацыяй. Адным з фактараў росту тавараабароту з'яўляецца адкрыццё новых гандлёвых сетак. У 2016 годзе прырост гандлёвых плошчаў склаў 130 тыс. кв.м, адкрыты 535 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Актывізавалася адкрыццё фірменных магазінаў айчынных тавараробцаў. Таксама ў Мінску ўзрасла забяспечанасць гандлёвымі плошчамі на 1 тысячу жыхароў, якая цяпер складае 615 кв.м (рэспубліканскі паказчык — 551 кв.м).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.01.2017 г.

Долар ЗША	1,9548	▲
Еўра	2,0699	▼
Рас. руб.	0,0327	▼
Укр. грыўня	0,0704	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 17010>

■ Ёсць пытанне!

НЕРЭНТАБЕЛЬНЫ ПАДЫХОД

Якія перашкоды стаяць на шляху сельскага прадпрымальніка?

Мы ўжо, здаецца, прывыклі да выказванняў на ўсіх узроўнях пра неабходнасць рацыянальнага выкарыстання будынкаў былых гандлёвых і сацыяльных аб'ектаў. Чыноўнікі заяўляюць з трыбун, а мы, журналісты, перыядычна і спраўна пішам, як важна прадаваць альбо аддаваць хоць бы за адну базавую пустыя школы, крамы, клубы... Абы толькі знаходзіліся людзі, якія змогуць удыхнуць у іх жыццё, стварыць хоць колькі новых рабочых месцаў. Заўсёды пад рукой ёсць лічбы, каб праілюстраваць «актыўны працэс», які ідзе ў гэтым кірунку. А вось калі даходзіць да справы ў тым ці іншым канкрэтным месцы...

СТАР. 4

■ «Звязда» даследуе праблему

СІРОЧЫ ХЛЕБ

Жыццё пасля дзіцячага дома

Стала добрай традыцыяй прыходзіць з дабрачыннымі акцыямі ў дзіцячыя дамы. Але мала хто задумваецца аб тым, што сіротам патрэбна дапамога і тады, калі яны пакідаюць сцены ўстановы. Ім рана даводзіцца сталець. Не так проста даецца пераход з-пад апекі дзяржавы да самастойнага жыцця. Калі няма падтрымкі бацькоў, многія ледзь зводзяць канцы з канцамі. У той час як іх равеснікі яшчэ могуць працягваць вучыцца і вяртацца пасля заняткаў на матуліны бліны, бязбацькавічам даводзіцца самім сябе забяспечваць. Але ці можна разлічваць на высокія заробкі, калі табе ўсяго 18?

Няроўныя шанцы

Уласна, шлях у дарослае жыццё ў выпускнікоў дзіцячых дамоў пачынаецца ўжо ў 15—17 гадоў — большасць сірот паступаюць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Праўда, і тут яны яшчэ застаюцца пад наглядам. Ім выдзяляюцца інтэрнаты, сацыяльна-псіхалагічныя службы курыруюць падлеткаў. І для многіх сірот гэта магчымасць затрымацца ў знаёмым асяроддзі — калі знаходзішся на поўным дзяржзабеспячэнні, не трэба на сябе ўзвальваць адразу процьму праблем: бытавых, эканамічных, сацыяльных...

Некаторым сіротам даводзіцца сутыкацца з непрыманнем грамадства. Часта знаходзяцца ахвочыя папракнуць «дармавой» кватэрай. Маўляў, чаго даваць яе людзям са складаным мінулым і няпэўнай будучыняй, яе трэба заслугоўваць.

СТАР. 5

НА БЕРАГАХ СІНЕЮЧАГА НІЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Егіпце падчас перагавораў Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Егіпта Абдэль Фатахам аль-Сісі кіраўнікі дзяржаў дамовіліся аб далейшым нарошчванні гандлёва-эканамічных сувязяў, павелічэнні беларускага экспарту з улікам патрэб егіпецкага боку і наладжванні двухбаковай вытворчай кааперацыі з выкарыстаннем беларускіх тэхналогій і вопыту. «Беларусь падтрымлівае зацікаўленасць Егіпта ў стварэнні зоны свабоднага гандлю з Еўразійскім эканамічным саюзам і гатова аказаць садзейнічанне ў вырашэнні гэтага пытання. Мы маем намер таксама пашыраць кантакты ў гуманітарнай галіне, уключаючы навуку, адукацыю, ахову здароўя, культуру, турызм і спорт», — адзначыў Прэзідэнт нашай краіны.

На сустрэчы была дасягнутая дамоўленасць, што ў найбліжэйшы час члены міжурадавай беларуска-егіпецкай камісіі сустрэнуцца ў Мінску і распрацуюць дарожную карту развіцця супрацоўніцтва паміж краінамі па самых розных кірунках.

Яшчэ адной тэмай перагавораў лідараў дзвюх краін стала знешнепалітычная сфера і ўзаемадзеянне на міжнароднай арэне — прэзідэнты пацвердзілі блізкасць пазіцый па галоўных пытаннях міжнароднага парадку дня, дамовіліся ўмацоўваць адносіны ў гэтым кірунку і надалей, асабліва з улікам таго, што Егіпет з'яўляецца членам Савета Бяспекі ААН.

Па выніках сустрэчы бакі падпісалі пакет дакументаў аб развіцці ўзаемадзеяння ў розных галінах. Сярод іх мемарандумы аб узаемаразуменні ў сферах культуры, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, аховы і рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў. Акрамя таго, падпісаны дарожная карта па рэалізацыі мемарандума ў гандлёва-эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах паміж Мінскай вобласцю і Паўднёвым Сінаем, дагаворы аб выдачы і ўзаемнай прававой дапамозе па грамадзянскіх і эканамічных справах, пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы фізічнай культуры і спорту.

Кіраўнікі дзяржаў таксама прынялі сумесную дэкларацыю, у якой падкрэслілі агульнае імкненне пашыраць беларуска-егіпецкае ўзаемадзеянне.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўсе падпісаныя дакументы нацэлены на ўмацаванне адносін паміж краінамі. Яны адыграюць важную ролю ў развіцці дагаворнай базы двухбаковых адносін. Кіраўнік беларускай дзяржавы запрасіў свайго егіпецкага калегу наведаць з візітам Мінск.

У другі дзень візіту ў Егіпет кіраўнік беларускай дзяржавы правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Егіпта Шэрыфам Ісмаілам, на якіх была адзначана важнасць умацавання двухбаковых адносін у эканамічнай і палітычнай сферах.

Потым Аляксандр Лукашэнка разам з Абдэль Фатахам аль-Сісі прыняў удзел у адкрыцці беларуска-егіпецкага дзелавога форуму, дзе было заяўлена, што паміж краінамі адкрываюцца новыя гарызонты супрацоўніцтва. У прыватнасці, Беларусь і Егіпет маюць намер паглыбляць кааперацыю ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, у ачыстцы грунтавых вод.

Лідары дзвюх краін таксама наведалі выставу беларускай тэхнікі, якая была адкрыта ў рамках дзелавога форуму.

У гэты ж дзень Прэзідэнт Беларусі правёў сустрэчу са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Егіпта Алі Абдэлем Алемам. На перагаворах былі абмеркаваны перспектывы развіцця ўзаемадзеяння паміж парламентамі дзвюх краін.

Учора Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам на поўдзень, у суседні з Егіптам Судан. Там у беларускага лідара запланаваныя перагаворы з Прэзідэнтам Судана Амарам Хасанам Ахмедам аль-Башырам, на якіх плануецца абмеркаваць перспектывы і асноўныя напрамкі развіцця беларуска-суданскіх адносін, вызначыць канкрэтныя крокі па іх пашырэнні. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена пытанням эканамічнага супрацоўніцтва. Чакаецца заключэнне шэрагу дамоўленасцяў аб развіцці ўзаемадзеяння ў розных сферах.

Плануюцца таксама сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з віцэ-прэзідэнтам Судана Хасабу Абдэльрахманам і старшынёй Нацыянальнай асамблеі Ібрагімам Амерам.

У сталіцы Судана ў час візіту Аляксандра Лукашэнкі пройдзе беларуска-суданскі дзелавы форум.

Паводле БЕЛТА.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР МАКАЕДА Мікалая Аляксандравіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

■ Блізкая ўлада

«Іншага такога няма!»

Сёлета на Полаччыне дасягнуты значныя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Жыхары горада і раёна актыўна рыхтуюцца да правядзення Дня пісьменства і не толькі. Пра гэта расказаў на сустрэчы з журналістамі старшыня Полацкага райвыканкама, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мікалай ШАЎЧУК.

Фота прадастаўлена газетай «Полацкі веснік».

Лічбы, якія радуюць

Сёлета ў раёне вырабілі прамысловай прадукцыі больш, чым летась (102,6%) і на 16% больш прыцягнулі інвестыцый у асноўны капітал.

— Рэнтабельнасць продажаў у прамысловасці склала 10,6%. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі ўзрасла на 10,7%. На 4,4% зніжаны ўзровень выдаткаў на вытворчасць прадукцыі. Выканана на 30% больш будаўніча-мантажных работ. Рознічны тавараабарот грамадскага харчавання павялічыўся на 2%. Рэнтабельнасць продажаў у цэлым па раёне склала 6,1%, — расказвае сенатар.

Ён прывёў прыклады мадэрнізацыі на прадпрыемствах. У прыватнасці, у акцыянерным таварыстве «Полацк-Шкловалакно» — адным з найбуйнейшых у хімічным комплексе краіны — рэалізаваны інвестыцыйны праект. Гэта дазволіла на чвэрць павялічыць аб'ёмы вытворчасці, стварыць 24 новыя працоўныя месцы. За 11 месяцаў 2016 года доля інавацыйнай прадукцыі на прадпрыемстве — 29,2% ад рэалізаванай. Экспарт ажыццяўляецца ў 55 краін.

У 3-м квартале завершана рэканструкцыя галоўнага вытворчага корпуса Наваполацкага завода тэхналагічных металаканструкцый. На базе Полацкага камбіната хлебапрадуктаў ствараецца холдынг.

Сёлета ў раёне на 765 працоўных месцаў стала больш. Перавыканалі гадавое заданне па будаўніцтве жылля. Здалі пад ключ больш за 24 тысячы квадратных метраў.

Інавацыйны турызм

Полацк з кожным годам наведвае ўсё больш гасцей.

— У нас звыш 150 помнікаў гісторыі, культуры, архітэктуры, археалогіі. 126 — у спісе помнікаў рэспубліканскага значэння. Горад заслужана з'яўляецца цэнтрам прыцягнення шматлікіх турыстаў з розных краін блізкага і далёкага замежжа. Прычым гаворка ідзе не толькі аб гісторыка-культурнай спадчыне Полацка, але і пра пазнавальны, навуковы, паломніцкі, аздараўленчы, водны і экатурызм, — працягвае Мікалай Шаўчук.

Выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ажыццяўляецца комплексна. Напрыклад, знакаміты Сафійскі сабор паспяхова функцыянуе не толькі як музей, але і як канцэртная зала, а таксама як месца для правядзення значных праваслаўных службаў. У прыватнасці, у Дзень памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай (5 чэрвеня) храм прадастаўляецца Полацкай епархіі для правядзення набажэнства, арганізацыі хрэснага ходу. У 2014 годзе верхняя і ніжняя пляцоўкі каля сабора сталі тэрыторыяй правядзення маштабнага фэсту сярэдневяковай культуры «Рубон», які з'яўляецца брэндам Полаччыны. Мерапрыемства сабрала звыш 5 тысяч чалавек. Падзея атрымала вялікі рэзананс на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях.

Сёлета пачалі рэалізоўваць інавацыйныя інтэрактыўныя праекты турыстычнай накіраванасці. Сярод іх турнір вулічных тэатраў «Тэатральная перамена», творчыя іміджавыя праекты: «Вуліца рамеснікаў», «Вулічныя музыкі», паэтычны open-air «Вершы над горадам» і іншыя.

Ізноў сталіца пісьменства

У Полацку ў 2017-м ізноў пройдзе Дзень пісьменства. Дарэчы, гэты год для горада асаблівы. Будуць адзначаць яго 1155-ю гадавіну, 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. У рамках падрыхтоўкі да ўрачыстых мерапрыемстваў плануецца правесці маштабнае добраўпарадкаванне, у тым ліку рэканструкцыю фантана на плошчы Францыска Скарыны і прылеглай тэрыторыі. Намецілі ажыццявіць рамонт помнікаў і асфальтавага пакрыцця двароў. У Полацку запланавана рэканструяваць аўтавакзал, увесці ў эксплуатацыю глядзельную залу гарадскога Палаца культуры, адрамантаваць фасад Музея беларускага кнігадрукавання...

— Вырашаецца пытанне аб стварэнні і ўстаноўцы падчас правядзення ўрачыстасцяў памятнага знака «Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці». Мы выдатна разумеем, што нам трэба ісці далей, расці, удасканальвацца, мяняць падыходы да ўжо традыцыйных рэчаў. Бо Полацк — гэта ўнікальны горад. Іншага такога няма! — дзеліцца планамі старшыня.

Ён заклікае землякоў усім разам рыхтавацца да юбілейных урачыстасцяў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Актуальна

Без глабальных узрушэнняў

Нашы прыярытэты на еўрапейскай адукацыйнай прасторы

Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА коратка пракаментаваў змяненні, якія плануюць унесці ў новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі, у эфіры тэлеканала «Беларусь-1».

— Казаць аб глабальных змяненнях я не стаў бы. Глабальныя ўзрушэнні нам не патрэбны, — адзначыў ён. — Разам з тым сістэма адукацыі павінна ўдасканальвацца і ісці ў нагу з часам. Новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі мы вынесем на шырокае абмеркаванне прафесіяналаў і беларускай грамадскасці. Дакумент размесцім на сайце Міністэрства адукацыі. Правядзём шэраг сур'ёзных сустрэч з педагогамі і заказчыкамі кадраў.

Асобна міністр спыніўся на папраўцы, якая дазволіць на месцах вырашаць пытанне з допускам у першы клас пяцігадовых дзяцей. Ён зазначыў, што і цяпер у школу могуць прыйсці дзеці, каму шэсць гадоў спаўняецца да 30 верасня, проста працэдура атрымання дазволу на гэта для бацькоў пакуль больш складаная і працяглая.

Адказваючы на пытанне пра магчымы адток моладзі з Беларусі пасля нашага ўступлення ў Балонскі працэс, Ігар Карпенка падкрэсліў, што рызыка такая ёсць, але ў той жа час перад намі адкрываюцца дадатковыя магчымасці для пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку па экспарце адукацыйных паслуг. «Балонскі працэс — гэта адкрытая адукацыйная прастора, і мы павінны дакладна разумець нашы прыярытэты. Кадры, якія рыхтуюцца за бюджэтныя сродкі, павінны забяспечваць, найперш, работу нашай эканомікі — стабільна, якасна, на высокім узроўні, з годнымі заробкамі», — упэўнены Ігар Карпенка.

Міністр адукацыі выступае за павышэнне адказнасці заказчыкаў кадраў за замацаванне маладога спецыяліста на працоўным месцы: «Сусветныя тэндэнцыі сёння такія, што многія краіны, разумеючы затратнасць адукацыйнага працэсу, імкнуцца перавабліваць да сябе падрыхтаваных спецыялістаў. У сувязі з гэтым нам важна працаваць з эканамічнай інфраструктурай. Павінна быць пэўная адказнасць заказчыкаў кадраў за замацаванне маладога спецыяліста на працоўным месцы. У рэшце рэшт, гэта задача не толькі сістэмы адукацыі, але і таго працадаўцы, які заказаў падрыхтаваць яму таго ці іншага спецыяліста, прычым за бюджэтныя грошы».

Змяненні ў Правілы прыёму ў ВНУ, зацверджаныя кіраўніком дзяржавы, як запэўніў Ігар Карпенка, былі чаканыя і рыхтаваліся па выніках аналізу апошняй уступнай кампаніі. Галоўная перавага беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі — роўны доступ да яе атрымання для ўсіх абітурыентаў, вынішчэнне карупцыйнага складніка. І ўсё ж асобныя аспекты патрабуюць удасканалення.

— Мы за сертыфікатамі часам не бачым асобу абітурыента, — падзяліўся сваімі думкамі міністр адукацыі. — Трэба падумаць, што мы можам зрабіць для таго, каб убачыць, наколькі малады чалавек матываваны на тую ці іншую прафесію.

Ігар Карпенка зазначыў, што абітурыенты, якія паступаюць у ВНУ, павінны мець дастаткова высокія балы. «Таму што паступленне — гэта толькі першы крок, а потым усіх чакае вельмі сур'ёзная насычаная праграма фундаментальнай падрыхтоўкі ў спалучэнні з прафесійнай і агульнагуманітарнай, і часам многія гэты тэмп не вытрымліваюць», — дадаў ён.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

З «БАЗАЙ» У ГАЛАВЕ

Бібліятэка для школьніка ў мабільнай праграме

Фінал рэспубліканскага конкурсу маладзёжных інавацыйных праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу» прайшоў у Мінску. Аўтары 13 праектаў, якія прайшлі ў паўфінал, прэзентавалі свае работы экспертнай групе. А ўсяго на конкурс, які праходзіў у тры этапы, было заяўлена 55 праектаў.



— Нас не можа не радаваць вялікая колькасць разумных, ініцыятыўных, ідэйных маладых людзей, якія імкнуцца заявіць пра сябе, — падкрэсліў **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Павел ЛІС.** — Рэспубліканскі конкурс — выдатная магчымасць для гэтага. Мы разгледзелі больш як 50 работ і стараліся ў першую чаргу падтрымаць тыя праекты, якія могуць прынесці рэальную карысць у будучыні. Не дзіўна, што вялікая частка прадстаўленых прэзентацый — мабільныя праграмы, бо конкурс быў арганізаваны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з мабільным аператарам МТС.

Пераможцамі ў намінацыі «Лепшы інавацыйны праект для навучэнцаў і студэнтаў ВНУ» сталі мабільная праграма «Бібліятэка для школьніка» (г. Глыбокае, Віцебская вобласць) і беларускі квэст «Скарбніца» (г. Гродна, ліцэй №1). У намінацыях «Лепшы інавацыйны праект для бацькоў» і «Лепшы інавацыйны праект для педагогаў» перамаглі праекты студэнтаў БДТУ «Вавёрка» і «Нормакантроль»; мабільная праграма «Навука дзецям»; «База рэзюмэ выпускнікоў»; QUALI.ME (Баранавічы, Івацэвічы, Наваполацк). Спецыяльны прыз ад кампаніі «Мабільныя ТэлеСістэмы» атрымаў праект ImagiBoo.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Пад кантролем

ЗАВЫШЭННЕ ЦЭН І НЯДОБРАСУМЛЕННАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

У Віцебску пакаранне за гэта панеслі два прадпрыемствы

Галоўным упраўленнем Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю па Віцебскай вобласці па выніках пазапланавай праверкі ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў» установлены факты неправамернага прымянення адпускных цэн на мукамольную прадукцыю.

Так, прадпрыемства рэалізоўвала яе для мэт хлебапячэння па адпускных цэнах, установленых для рэалізацыі ў рознічным гандлі. Тым самым быў парушаны артыкул 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 1999 года «Аб цэнаўтварэнні», паведамілі ў прэс-службе міністэрства.

Пастановамі эканамічнага суда Віцебскай вобласці, у адпаведнасці з часткамі 1 і 2 артыкула 12.4 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, накладзены штраф на ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў» і на службовую асобу (начальніка аддзела маркетынгу). Памер штрафу на прадпрыемства вызначаны ў двухразовым памеры розніцы паміж фактычнай выручкай, атрыманай ад рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), і разліковай велічынёй выручкі ад рэалізацыі гэтых тавараў (работ, паслуг) па цэнах (тарыфах), установленых у адпаведнасці з заканадаўствам, і склаў 852 рублі 62 капейкі. На службовую асобу накладзены штраф у памеры адной базавай велічыні (21 рубель). Пастановы ўступілі ў законную сілу, ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў» яны абскарджаны не былі.

Таксама галоўным упраўленнем Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю па Віцебскай вобласці ўстаноўлены факт нядобрасумленнай канкурэнцыі ў дзеяннях ЗАТ «Пажтэхніка», якая праявілася ў неабгрунтаванай адмове арганізацыям-канкурэнтам, што вядуць дзейнасць па тэхнічным абслугоўванні вогнетушыцеляў марак «Міг» і «Іней», у прадастаўленні інструкцый па тэхнічным абслугоўванні і перазарадцы вогнетушыцеляў, а таксама распаўсюджванні інфармацыі аб адсутнасці права іншых арганізацый ажыццяўляць тэхнічнае абслугоўванне вогнетушыцеляў названых марак. Антыманапольным органам прынятае рашэнне і накіравана ў эканамічны суд Віцебскай вобласці пастанова аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці і накладанні штрафу як на ЗАТ «Пажтэхніка», так і на генеральнага дырэктара гэтай арганізацыі. Эканамічны суд прызнаў факт ажыццяўлення нядобрасумленнай канкурэнцыі ў дзеяннях ЗАТ і яго генеральнага дырэктара.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Надвор'е

МАРАЗЫ ПРАТРЫМАЮЦЦА ДА ВАДОХРЫШЧА

А ў пятніцу сіноптыкі прагназуюць чарговую адлігу нават з дажджом

У першую палову тыдня на Беларусі чакаецца ўмерана марознае надвор'е, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Сёння ўдзень толькі ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег. Максімальная тэмпература паветра складзе 2—8 градусаў марозу. Далей да чацвярга маразы будуць толькі мацнець. Чакаецца, што ў сераду будзе пераважна без ападкаў. У асобных раёнах чакаецца слабы туман, шэрань, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 да мінус 15 градусаў, пры праясненнях чакаецца да 18 марозу. Удзень таксама будзе падмарожваць да мінус 4—9 градусаў.

Уначы на Вадохрышча чакаецца ўмерана марознае надвор'е, калі тэмпература паветра прагназуецца ад мінус 5 да мінус 11 градусаў, па паўднёва-ўсходняй палове — 12—16 марозу, а пры праясненнях будзе да мінус 18 градусаў. У чацвер удзень тэмпература паветра будзе вагацца ад нуля па паўночным захадзе да мінус 7 градусаў на поўдні Беларусі. Уначы ў крайніх паўночных раёнах пройдзе невялікі снег. Удзень пераважна па паўночнай палове краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, а па паўночным захадзе — мокры снег з дажджом. Паўсюдна магчымы слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца.

Паводле слоў сіноптыка, далей надвор'ем пачне кіраваць Атлантыка, бо ў Беларусь будзе паступаць сагрэтае Гальфстрымам цёплае і вільготнае паветра. Тэмпература паветра пачне павялічвацца не зусім традыцыйна, бо цяплей на гэты раз будзе па поўначы Беларусі. У пятніцу ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж), магчымы слабыя туман і галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, пры праясненнях па паўднёвым захадзе будзе да мінус 11 градусаў. А ўдзень чакаецца чарговая адліга, калі прагназуецца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Таксама мяккае надвор'е са слабымі маразамі ўначы і невялікім плюсам удзень прагназуюць сіноптыкі і ў выхадныя.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

ПАЛЕТЫ ЧЭМПІЁНА ПРЫНОСЯЦЬ УЗНАГАРОДЫ

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі пятага этапу Кубка свету па біятлоне, другі поспех Антона Кушніра ў спаборніцтвах фрыстайлістаў і пра вынікі беларускай каманды на завершаным «Дакары».

1. Кубак свету па біятлоне ў Рупольдынгу завяршыўся двума гонкамі пераследу. Дар'я Домрачава, якая заняла 13-е месца ў спрынце, на старт у нядзелю не выйшла. Найлепшы вынік з беларусак паказала Надзея Скардзіна, заняўшы 27-е месца, Ірына Крыўко завяршыла гонку 39-й.

У мужчынскай гонцы пераследу з прадстаўнікоў нашай краіны выступілі Уладзімір Чапелін, які стаў 29-м, і Сяргей Бачарнікаў, які фінішаваў 47-м.

Наступны, шосты, этап Кубка свету пройдзе ў італьянскім Антхольцы з 19 па 22 студзеня.

2. Алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір стаў пераможцам этапу Кубка свету ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе. Такім чынам, ён другі раз за сезон падняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала. Нагадаем, раней Кушнір стаў пераможцам першага этапу ў кітайскім Бэйда Лэйк.

Фіналістамі мужчынскіх спаборніцтваў у Лэйк-Плэсідзе таксама былі яшчэ два беларусы. Станіслаў Гладчанка заняў выніковае 7-е месца, Максім Гусцік — 9-е.

Антон Кушнір узначаліў агульны залік Кубка свету сёлетняга сезона сярод лыжных акрабатаў. На яго рахунку 208 балаў.

У жаночых спаборніцтвах у Лэйк-Плэсідзе самы лепшы сярод беларусак вынік у Аляксандры Раманоўскай (8-е месца), Ганна Гуськова была 26-й.

3. Мінскае «Дынама» ўзяло рэванш у кітайскага клуба «Куньлунь». На гасцявой пляцоўцы «зубры» давялі сустрэчу да серыі паслядматчавых кідкоў і там сталі мацнейшымі — 3:2. Нагадаем, раней, 10 лістапада, сустрэча гэтых каманд скончылася паражэннем мінчан 3:4.

Учора перамогай (5:3) у матчы супраць «Адмірала» з Уладзівастока «Дынама» скончыла выязную серыю. Іх наступны матч пройдзе на «Мінск-Арэне» 19 студзеня супраць рыжскіх аднаклубнікаў.

4. Беларускія гоншчыкі «МАЗ-СПОРТаўта» паказалі самы высокі вынік за час выступлення на «Дакары». Экіпаж пад кіраўніцтвам Аляксандра Васілеўскага завяршыў марафон на шостым месцы. Такім чынам, Васілеўскі перавысіў уласнае дасягненне. У 2015 годзе яго экіпаж заняў 10-е месца на «Дакары».

Апошні спецучастак з фінішам у Буэнас-Айрасе стаў даволі простым і, як і чакалася, не паўплываў на вынік. Найлепшы час на этапе сярод беларусаў паказаў МАЗ Сяргея Вязовіча, які заняў трэцяе месца. Экіпаж пад кіраўніцтвам Аляксандра Васілеўскага фінішаваў у сталіцы Аргенціны дзявятым, МАЗ Аляксея Вішнеўскага прыйшоў да фінішу 17-м.

Чэмпіёнам ралі-рэйду «Дакар-2017» стаў экіпаж пад кіраўніцтвам расіяніна Эдуарда Мікалаева на Камазе. Беларус Аляксандр Васілеўскі, які заняў шостую пазіцыю ў агульным заліку, саступіў яму прыкладна 2 гадзіны 35 хвілін.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ І мы там былі

КАЛІ ГАЛАВА КРУЖЫЦЦА НЕ АД ШАМПАНСКАГА

Як прайшоў сталічны баль у духу венскага

Падаецца, усіх нявест з горада Мінска сабралі ў адной зале. Дзясяткі дзяўчат у белых пышных сукенках пад руку з кавалерамі ў чорных касцюмах ці ў мундзірах з пагонамі восем гадзін выконвалі класічныя бальныя ды народныя танцы. Такім чынам можна было пазнаць тых, хто ўпершыню бярэ ўдзел у Мінскім балі праваслаўнай моладзі, што адбыўся ў мінулую нядзелю ўжо дзявяты раз. У гэтым годзе арганізатары зладзілі яго ў венскім стылі.

Згодна з правіламі аўстрыйскага заканадаўца бальных мод — штогадовага Венскага балю — дзяўчаты, якія першы раз удзельнічаюць у мерапрыемстве, мусяць здаць экзамен у выглядзе эсэ на веданне літаратуры, замежных моў і правілаў этыкету. А потым апрануць белую сукенку, дыядэму, белыя пальчаткі на баль і станцаваць на ім вальс дэбютантаў. У беларускім варыянце абышліся без першай часткі, але асаблівую ўвагу ўдзялілі другой. Карэспандэнт «Звязды» не спужалася апрануць вясельную сукенку і таксама акунулася ў атмасферу забаў моладзі XIX стагоддзя.

Для таго каб выканаць належным чынам усе танцы, спатрэбілася тры месяцы трэніровак. Два разы на тыдзень па 3—4 гадзіны мы вучылі дзясятак разнаваднасцяў вальсаў, адточвалі павароты галавы падчас танга і спрабавалі як мінімум не наступаць свайму партнёру на ногі. За гэты час, разазнаёміўшыся, зразумелі, што танцаваць могуць усе: эканамісты, праграмісты, інжынеры, дактары, настаўніцы, маці з маленькімі дзецьмі, бізнесмены, навукоўцы і нават журналісты. «У танцы я бачу філасофію жыцця, — расказвае **Лідзія КАЦ-ЛАЗАРАВА, кіраўнік клуба бальных танцаў «Мара»**, якая праводзіла рэпетыцыі на асноўнай пляцоўцы. — Калі казаць пра ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны, то танец — гэта здольнасць дамаўляцца без слоў, спроба адчуць партнёра, магчымасць выстройваць адносіны этычна».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сапраўды, шмат хто з удзельнікаў прызнаецца, што прыйшоў не толькі атрымаць асалоду ад вальсаў, але і адшукаць другую палову. Традыцыйна на кожным балі ёсць танец маладзёнаў, на якім сваё майстэрства дэманструюць тыя, хто пазнаёміўся на мерапрыемстве і потым ажаніўся. Шмат хто з іх прыходзіць ужо разам з дзецьмі.

Па словах **Аксаны ЧЫРКО, галоўнага каардынатара сёлетняга балю** і па сумяшчальніцтве кансультанта па падборы пар, пакуль дзяўчат прыходзіць значна больш, чым хлопцаў. Асабліва гэта было відаць па танцы «Па-дэ-труа», дзе кожны мужчына мусіць танцаваць адразу з дзвюма жанчынамі. Кожны з удзельнікаў дужага полу без праблем адшукаў сабе ў пару дзвюх дзяўчат. «Мужчыны чамусьці лічаць, што танцы — гэта не мужна. Маўляў, лепш я пайду ў трэнажорную залу ці спартыўную секцыю. Але танец — гэта вельмі па-мужчынску. Бо ў танцавальнай пары жанчыну вядзе менавіта мужчына, а не наадварот», — лічыць Аксана Чырко.

Праўда, аднымі танцамі арганізатары не абмежаваліся. Таксама на балі можна было пабачыць вакальныя і харэаграфічныя выступы, паўдзельнічаць у літаратурна-музычнай гасцёўні, зрабіць здымкі ў прафесійных фатографаў у спецыяльных зонах, атрымаць партрэт ад шаржыста і пачаставацца а-ля венскімі дэсертамі падчас фуршэту. Вядома, што баль менавіта праваслаўнай моладзі, таму самы моцны градус напояў мелі гарачыя кава ды гарбата. Але галава ад пастаяннага вальсавага павароту кружылася не менш, чым ад шампанскага. А калі прыйшоў час здымаць абцасы, расшнуроўваць адна адной тугія гарсэты і акуратна разбіраць мудрагелістыя прычоскі, дзяўчаты толькі паспявалі са здзіўленнем абменьвацца пытаннем без адказу: «І адкуль гэткая эйфарыя?..»

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

НЕРЭНТАБЕЛЬНЫ ПАДЫХОД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВЁСКА Тэўлі Кобрынскага раёна — зусім не забыты Богам край. Гэта сучасны населены пункт, у які нядаўна праведзены газ, а чыгуначная станцыя робіць вёску яшчэ больш значнай. Тут прыпынак робяць нават асобныя маскоўскія цягнікі, не кажучы пра штодзённыя электрычкі баранавіцка-мінскага напрамку. За 10 кіламетраў ад Тэўляў знаходзіцца папулярны турыстычны аб'ект — страусавая ферма, значыць, транзітныя турысты тут не рэдкасць. Менавіта пра тое, што і сам населены пункт павінен адпавядаць усяму вышэйпералічанаму, асабліва ў частцы сваіх гандлёвых аб'ектаў, мы гаварылі з мясцовымі жыхарамі Клаўдзіяй Літвінчук, Наталляй Кірылюк, Любоўю Польскай. Яны і сталі ініцыятарамі прыезду карэспандэнта ў іх вёску і вельмі рэкамендавалі пазнаёміцца з прадпрымальнікам Юліяй Шэвелевай.

Юлія — дырэктар прыватнага прадпрыемства і гаспадыня прыватнага магазіна «Нікольскі». Названая крама не проста знешне прывабны гандлёвы аб'ект — яна адпавядае ўсім запытам пакупнікоў. Асартымент — самы разнастайны, чысцінёй, парадкам, прыгажосцю сельскі магазінчык не адрозніваецца ад сучасных сталічных і брэсцкіх. Акрамя прадуктаў, ёсць аддзел прамысловых тавараў, прадаюцца нават газеты і часопісы. Крама працуе з дзевяці да дзевяці без выхадных. У магазіне ўстаноўлены інфакіёск Белпошты, але пра гэта крыху пазней.

Юлія Мікалаеўна запрашае ў падсобныя памяшканні, яны таксама ў поўным парадку, тут і гарачая вада, і ўмывальнікі, і столік для прыёму ежы персаналам. Хоць у краме працуюць усяго тры чалавекі, і яны мясцовыя жыхары, але патрабаванні санітарных службаў даволі жорсткія. Больш за тое, яны патрабуюць, каб пакой для прыёму ежы персаналу быў асобны. Прэтэнзіі былі б зразумелымі ў фірмах, дзе працуюць 300 чалавек альбо нават 30, а ў іх толькі тры, і тыя па зменах. Таму Юлія здзівілася, калі атрымала павестку ў суд за гэтае самае парушэнне — адсутнасць асобнага пакоя для прыёму ежы. У судзе таксама здзівіліся... Ды бадай што любы прадпрымальнік можа згадаць выпадкі асаблівых да сябе адносін з боку розных кантрольных службаў. Але, паводле слоў Юліі, пэўную надзею ўсяляюць заявы, якія нядаўна прагучалі на самым высокім узроўні, аб упарадкаванні сістэмы кантролю. Бо апошнія два гады яе надта ж часта правяралі.

Ды яна і рада зрабіць той асобны пакой, толькі месца на яго не хапае. А яшчэ ёсць задумка абсталяваць міні-кафетэрый на адзін-два столікі. Тут жа чыгуначная станцыя за дзве мінуты хадзьбы. Бывае, прыезджыя забягаюць, просяць зрабіць кавы. А дзе іх пасадзіць? Ды і бабулькі вясковыя заходзяць па пакупкі альбо зрабіць плацеж праз інфакіёск. Ім бы прысесці, аддыхацца. Таму падобны кафетэрый вельмі патрэбны, ды і гандаль можна было б пашырыць.

Тым больш што ў тым жа будынку, дзе знаходзяцца «Нікольскі» і яшчэ адна крама райспажыўтаварыства, ёсць свабодныя памяшканні, на якіх красуецца шыльда «Прадаецца». Але ўмовы продажу прапануюцца такія, што купіць, мякка кажучы, вельмі складана. Пачнём з таго, што будынак узведзены прыкладна 60 гадоў таму. Па сценах дзе-нідзе пайшлі расколіны. Нават пад снегам можна заўважыць, як дах прыкметна прасеў. Аконныя праёмы закладзеныя блокамі і замураваныя. Па неправераных чутках — так, прынамсі, сцвярджалі мясцовыя жыхары — вечарамі з магазіна выносяць плітку і іншыя будматэрыялы. Яно і не дзіва. Памяшканне стаіць на замку апошнія паўтара дзясятка гадоў. Адным словам, выгляд і становішча гэтай будыніны адпаведныя. А вось заплаціць прадпрымальніку за яе прапануюць... прыкладна 150 мільёнаў. (Называю ў старых грашах, бо ўсе дакументы, якія ёсць у Юліі Шэвелевай, складаліся год таму, там фігуруюць сумы да дэнамінацыі.) Пры тым, што на сайце Белкаапсаюза пазначаны астаткавы кошт гэтага будынка — 12,5 мільёна рублёў. Праўда, з'явілася тая інфармацыя даўно — памяшканне пустуе, як было сказана, працяглы час. Але лепшым за гэты час яно дакладна не стала.

ЮЛІЯ звярталася і ў Брэсцкі аблспажыўсаюз, і ў рэспубліканскую структуру — адказы гучаць прыкладна так: магазін у Тэўлях належыць Кобрынскаму спажывецкаму таварыству, вырашайце пытанне з уласнікам. У райвыканкаме памкненні маладога прадпрымальніка падтрымліваюць. Была Юлія і на прыёме ў старшыні выканкама Аляксандра Зазулі. Ёй патлумачылі, што ўказаны будынак не з'яўляецца камунальнай уласнасцю раёна, якой выканкам можа распарадзіцца.

«Чаму ў нас усё кругом нельга? — не можа зразумець вясковая грамадская актывістка Наталля Кірылюк. — Што дрэннага было б у тым, каб прадпрымальніца купіла па прымальнай цане гэты будынак, які, па сутнасці, развальваецца?»

Старшыня праўлення Кобрынскага спажывецкага таварыства Валерый КАРНЯЛЮК у тэлефоннай гутарцы з карэспандэнтам газеты сказаў так:

— Праблему ведаю. Прыняць умовы прадпрымальніцы азначае для мяне пайсці на прамое парушэнне закона. Ацэнка гэтага будынка не праводзілася, але адпаведныя дзяржаўныя структуры ацэньвалі аналагічныя аб'екты — атрымліваецца прыкладна мільёнаў 600 (старымі грашыма. — **Аўт.**). Калі прымяніць усе паніжаючыя каэфіцыенты, правесці іншыя працэдуры, можна знізіць цану максімальна да 150—140 мільёнаў. Але не менш, не так, як хоча прадпрымальніца, — купіць усяго за 10—12 мільёнаў. Я магу дзейнічаць толькі ў рамках закона.

Такім чынам, атрымліваецца замкнёнае кола. Ацэнку не праводзілі, а краму як быццам бы прадаюць. Юлія сказала, што за ацэнку і тэхнічны пашпарт ёй трэба было б заплаціць асобна, акрамя названых 150 мільёнаў... Мяркуючы па ўсім, шыльда са словам «Прадаецца» будзе вісець у Тэўлях яшчэ доўга.

У кастрычніку 2015 года на пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама разглядалі пытанне работы аблспажыўсаюза. Там было заяўлена, што да 2020 года кааператары маюць намер зняць праблему нерэнтабельных аб'ектаў на вёсцы. Шмат гаварылася пра неабходнасць прыцягнення ў абарот пустуючых будынкаў, для чаго кіраўнікам райвыканкамаў прапаноўвалася пераводзіць іх у камунальную ўласнасць.

Намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза Варвара ПЛАТОНАВА паведаміла, што рыхтуецца праект дакумента, па якім можна будзе прадаваць пустуючы будынак нават за адну базавую велічыню. Публікацыю пра тое пасяджэнне выканкама Юлія захоўвае ў сябе: «Проста як пра нас гаварылі — важныя, правільныя словы! А воз, выходзіць, і зараз там».

— Чаму ў нас усё кругом нельга? — не можа зразумець вясковая грамадская актывістка Наталля Кірылюк. — Што дрэннага было б у тым, каб прадпрымальніца купіла па прымальнай цане гэты будынак, які, па сутнасці, развальваецца? І стварыла там хоць два-тры рабочыя месцы? У вёсцы ж спрэс без работы сядзяць.

— Таму што мы «нерэнтабельныя», — уступае ў размову пенсіянерка, былая настаўніца Клаўдзія Літвінчук. — Нам увесь час пра гэта гавораць. Ну, хоць бы з тым інфакіёскам. Колькі за яго біліся, подпісы збіралі! Так зручна цяпер за ўсё плаціць. Ужо нават бабулькі навучыліся тым кіёскам карыстацца, а калі што, прадаўцы дапамогуць... Дык не — не столькі выручкі ён дае, як яны сабе запланавалі. Ужо адзін раз прыязджалі забіраць, мы неяк адстаялі. Пагражаюць зрабіць гэта праз тры месяцы.

— У нас любяць усё спісваць на нерэнтабельнасць і закрываць, — гаворыць Любоў Польская. — Іншым разам хочацца спытаць: «А што зрабілі вы, каб нашы аб'екты ў вёсцы былі рэнтабельныя?» А можа, гэта падыход нерэнтабельны? Калі былы магазін стаіць з замазанымі вокнамі, знешні выгляд вёскі псуе, стварае ўражанне ўсеагульнай закінутасці — гэта ўсіх задавальняе. А калі падысці па-гаспадарску, то будзе альбо незаконна, альбо нерэнтабельна.

І з Любоўю Гаўрылаўнай цяжка паспрачацца. Сведчанне таму — будынак былога камбіната бытавога абслугоўвання. Некалі яго не прадалі прадпрымальніку за пэўную суму — невядома чаму. Цяпер, праз гады, прадаюць за адну базавую — але ніхто ўжо не купляе...

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by
Кобрынскі раён.

■ Цуд прыроды

Ягада з прысмакам партнёрскіх адносін

Як на кітайскіх землях вырошчваюць беларускія журавіны

Беларусь вядома не толькі як краіна блакітных азёр, але і шматлікіх тарфяных балот. Таму пра карысныя ўласцівасці журавін, якія там растуць, мы ведаем не па чутках. Акрамя збору ў натуральных умовах, гэтую ягаду ў нас яшчэ вырошчваюць і ў прамысловых маштабах. Статус «скарбніцы вітамінаў» ад гэтага яна не губляе, адрозніваецца толькі выглядам: дробная балотная і буйнаплодная садовая. Тэхналогіяй культывацыі менавіта буйнаплоднай ягады і зацікавіліся кітайскія даследчыкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— У прыродзе на беларускіх землях такія журавіны не сустракаюцца. Яны ў канцы 1970-х гадоў былі прывезены з Паўночнай Амерыкі. Так быў створаны першасны калекцыйны фонд, у якім было ўсяго 4 гатункі: Ранні Чорны, Бергман, Франклін і Ховес. Гэта паслужыла пачаткам развіцця такой галіны сельскай гаспадаркі, як нетрадыцыйнае ягадаводства, — расказаў **загадчык лабараторыі экалагічнай фізіялогіі раслін ДНУ «Цэнтральны батанічны сад», кандыдат біялагічных навук, дацэнт Аляксандр ЯКАЎЛЕЎ**. — Гатункі паспяхова прайшлі інтрадукцыйны, інакш кажучы, уступны перыяд, пасля чаго быў зроблены вывад, што гэтая культура перспектыўная для ўмоў рэспублікі. За 40 гадоў фонд істотна ўзбагаціўся не толькі паўночнаамерыканскімі, але і еўрапейскімі, у прыватнасці фінскімі, гатункамі. Вялікі аб'ём работы па культывацыі расліны быў праведзены прадстаўнікамі Акадэміі навук.

Даследаванні гэтай культуры прыцягнулі ўвагу спецыялістаў з Паўночна-ўсходняга інстытута геаграфіі і аграэкалогіі, які адносіцца да Чаньчуньскага аддзялення Кітайскай акадэміі навук. Інстытут знаходзіцца ў аграрнай правінцыі, якая займаецца галоўным чынам вырошчваннем рысу і кукурузы.

— У 2013 годзе кітайская дэлегацыя ўпершыню прыехала да нас, каб пазнаёміцца з тэхналогіяй вырошчвання журавін. Характэрна, што да таго моманту ў іх краіне наогул не праводзіліся ніякія работы ў гэтай сферы ні ў навуковым, ні ў практычным плане. Усе буйнаплодныя журавіны, якія зараз паступаюць да іх на рынак, — гэта ягады з паўночнаамерыканскага кантынента. Паколькі попыт на гэты вітамінны тавар вельмі высокі, для эканомікі дзяржавы выгадна самастойна запаўняць унутраны рынак, — расказаў Аляксандр Якаўлеў. — Праз год кітайскія калегі запрасілі нас да сябе — паказаць невялікі доследны палігон. Мы ўзялі ўзоры глебы для правядзення аграхімічнага аналізу, аднак нават знешне можна было вызначыць: яно не зусім тое, што трэба для гэтай культуры, таму на пачатковым этапе могуць узнікнуць пэўныя цяжкасці. Даследчыкі наша меркаванне выслухалі, аднак не занадта шмат звярнулі на яго належнай увагі і працягнулі самастойную працу.

Тым не менш вынікі былі несуцяшальныя. І праз некаторы час кітайскія біёлагі звярнуліся да беларускіх з просьбай аб прадастаўленні пасадачнага матэрыялу. Быў падпісаны кантракт на пастаўку 5 тысяч укаранёных чаранкоў, прызначаных, хутчэй, для эксперыменту, чым для рэальнай вытворчасці. Прытарможваюць развіццё гэтай галіны яшчэ і далёкія ад батанікі пытанні. У Кітаі практычна ўся зямля знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, таму пра пасадку журавін трэба дамаўляцца з уладальнікамі палёў. Не ўсе з іх гатовыя рызыкнуць, бо гэтая ягада, у адрозненне ад той жа трускаўкі, пладаносіць не на першы, а на трэці год. А часам і наогул — толькі на пяты-шосты. Аднак ёсць і прыемныя моманты — у спрыяльных умовах ураджай можа перавышаць 5 тон з гектара.

У мінулым годзе была закуплена яшчэ адна партыя чаранкоў, на гэты раз ужо 10 тысяч. А з трохгадовых пасадак быў сабраны першы ўраджай. Падчас візітаў у Кітай працэс вырошчвання ягад кантраляваўся беларускімі навукоўцамі. Аднак даследаванні насілі эпізадычны, не занадта эфектыўны характар, таму было прынята рашэнне аб стварэнні Беларуска-кітайскай лабараторыі па інтрадукцыі перспектыўных гаспадарча-карысных відаў раслін з філіяламі ў абедзвюх краінах. Зараз праект знаходзіцца на стадыі зацвярджэння.

— Тэмпература і вільготнасць у гэтай кітайскай мясцовасці блізкія да нашай Віцебскай вобласці. Патрэбна дадатковая аэрацыя, але ўздоўж поймаў рэк гэта лёгка здзейсніць. Адрозніваецца склад глебы з-за раслін-торфастваральнікаў, аднак гэта не робіць працэс культывацыі немагчымым, — адзначыў даследчык. — Журавіны буйнаплодныя цікавяць кітайцаў пераважна як сыравіна для перапрацоўкі, бо ў такім выглядзе іх кошт істотна павышаецца. З ягад можна атрымаць канцэнтраваны сок, пасля чаго жмых выкарыстаць для вытворчасці клюзюма — своеасаблівых разынак з журавін, настоеных у цукровым сіропе. Гэты прадукт актыўна выкарыстоўваецца ў хлебабулачных вырабах. Цукровы сіроп з водарам і прысмакам журавін — яшчэ адзін тавар, прычым усе яны захоўваюць карысныя ўласцівасці практычна ў поўным аб'ёме. Атрымліваецца абсалютна бездаходная вытворчасць. Так з 2 долараў за кілаграм свежых журавін атрымліваецца сума ў 2,5—3 разы большая за патрачаную.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

• КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Прадпрымальнікі едуць у Ганконг

Сёння ў Кітаі адкрываецца бізнес-форум, які прэзентуе Беларусь

Пра гэта расказаў міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА. У эканоміцы бачны пераход ад гандлю да рэалізацыі буйных інвестыцыйных праектаў з крэдытнай падтрымкай з боку Кітая. Мы занатавалі, якія яшчэ ёсць перспектывы ў двухбаковым супрацоўніцтве.

— За 25 гадоў наш тавараабарот вырас амаль у сто разоў. А пачыналася ўсё з $34 млн. Сёння мы сумесна рэалізуем больш за 30 інвестыцыйных праектаў, што фінансуюцца крэдытамі кітайскіх банкаў і ўрада на агульную суму каля $6 млрд у энергетыцы, прамысловасці, транспартнай інфраструктуры, нерухомасці, тэлекамунікацыі і іншых галінах. Пабудаваны прамысловыя прадпрыемствы, дарогі, ЦЭЦ.

Галоўным праектам двухбаковых эканамічных адносін Уладзімір Макей лічыць індустрыяльны парк «Вялікі камень». У Еўропе ён з'яўляецца самым буйным індустрыяльным паркам з удзелам кітайскага капіталу. «Мы спадзяёмся на яго інтэнсіўнае развіццё, прыцягненне сур'ёзных рэзідэнтаў, ператварэнне гэтага праекта ў сапраўдную «жамчужыну эканамічнага пояса Шаўковага шляху».

Другім перспектыўным кірункам эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца лагістыка. Беларусь займае выгаднае становішча, звязвае Еўрапейскі і Еўразійскі саюзы. «Мы актыўна развіваем участкі транскантынентальных транспартных калідораў, удасканальваем лагістычную інфраструктуру на сваёй тэрыторыі. Мяркую, гэтая інфраструктура і транзітны патэнцыял могуць атрымаць значнае развіццё разам з ростам тавараперакатокаў Кітай—Еўропа па новым Шаўковым шляху».

Рэгіянальнае супрацоўніцтва — сфера, дзе для развіцця партнёрства яшчэ ёсць рэзервы. «Мяркую, што ў ім хаваецца асноўны патэнцыял развіцця на наступныя 25 гадоў. Кожная правінцыя Кітая, а часам і горад, па колькасці насельніцтва, тэрыторыі, эканамічным патэнцыяле — гэта як асобная краіна, супастаўная з Італіяй, Нідэрландамі або Францыяй».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

СІРОЧЫ ХЛЕБ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але мала хто задумваецца, што для адзінокіх маладых людзей такі падарунак дзяржавы, як жыллё — усяго толькі спроба хоць крыху ўраўняць шанцы ў барацьбе за месца пад сонцам. Усё ж сваё самастойнае жыццё ім даводзіцца пачынаць з нуля. Прычым вучыцца не толькі весці ўласную гаспадарку і зарабляць грошы, але і наладжваць кантакты. Бо адна справа, калі ты знаходзішся ва ўстанове з усталяваным рэжымам і правіламі, і зусім іншая, калі выходзіш у вялікі свет.

«Як ні дзіўна, ніхто з дзяцей пра сваіх бацькоў, пазбаўленых правоў, не гаворыць дрэнна. Нават калі яны памятаюць, што дома былі п'янкі, скандалы, даводзілася сядзець галоднымі, прапускаць школу».

Ці многія дамашнія хлопчыкі і дзяўчынкі ў такім узросце гатовы да самастойнага жыцця? Але ў іх недахоп ведаў і ўменняў кампенсуецца бацькоўскай падтрымкай. Куды складаней выжываць, калі ў цябе нікога няма і, па сутнасці, ты нікому не патрэбны. Акрамя таго, часта бязбацькавічы могуць прайграваць на рынку працы. Не таму, што ў іх меншы патэнцыял, проста стартавыя ўмовы ў сірот іншыя. Рэдка выпускнікі дзіцячых дамоў атрымліваюць вышэйшую адукацыю.

Гены?

На жаль, нярэдка сацыяльныя сіроты капіруюць жыццё сваіх бацькоў. Алкаголь, наркотыкі, дрэнныя кампаніі, крымінал. Некаторыя выпускнікі дзіцячых дамоў проста не разумеюць, што рабіць з нарэшце атрыманай свабодай. Хтосьці пачынае «фестываліць», каб не думаць пра дарослыя праблемы, што раптам зваліліся на галаву. А вярнуцца ў «цвярозае» жыццё зусім не проста.

Часам сіроты самі становяцца няўдалымі бацькамі...

Чаму адбываецца такі паўтор лёсаў і як вырвацца з няўдалага жыццёвага кола, спрабую высветліць у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання Ленінскага раёна горада Мінска.

— Як ні дзіўна, ніхто з дзяцей пра сваіх бацькоў, пазбаўленых правоў, не гаворыць дрэнна. Нават калі яны памятаюць, што дома былі п'янкі, скандалы, даводзілася сядзець галоднымі, прапускаць школу. На мой погляд, нейкая ломка адбываецца ў асяроддзі, пазбаўленым сям'і. Трэба шукаць новую форму ўладкавання дзіцячых устаноў, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі маглі б пераймаць такія мадэлі паводзін, якія спатрэбяцца для самастойнага жыцця, — разважае **загадчык аддзялення суправаджальнага пражывання Юлія КОШКІНА.** — Многія маладыя людзі слаба ўяўляюць, што рабіць з атрыманым жыллём. Яны не ведаюць, як прадукты з'яўляюцца на стале, гатуюцца. Яны хочуць мець многа грошай, але не разумеюць, што для гэтага трэба прыкладаць пэўныя намаганні. Парушаны прычынна-выніковыя сувязі. Іншыя мараць адразу пра вялікія заробкі, не жадаюць ісці на работу за 300 рублёў, і даводзіцца тлумачыць, што трэба хоць бы з нечага пачынаць. У такім узросце няма да канца і разумення адказнасці, прычым не толькі за сябе. Дзяўчаты рана становяцца мамамі. У працэнтах васьмідзесяці яны не замужам і выхоўваюць дзетак адны.

Дзве дзяўчыны з ліку былых выхаванак сіроцкіх устаноў у раёне ўжо самі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Але разам з тым тут ёсць маладыя мамы, якія, нягледзячы на нявопытнасць, памылкі, складанасці, спрабуюць змагацца за сваю маленькую сям'ю. Сацыяльныя работнікі курыруюць дзяўчынку, якая нядаўна нарадзіла хлопчыка.

— Калі яна была цяжарнай, мы бачылі, наколькі для яе гэта чаканае дзіця, — расказвае Юлія. — Часта выхаванцы дзіцячых дамоў падтрымліваюць сувязь са сваімі бацькамі. Тут маці схіляла дачку зрабіць аборт. Але атрымала адказ: «Я не буду такой, як ты, нараджу дзіця і выхаваю!» І мы спадзяёмся, што ў дзяўчыны ўсё атрымаецца.

З новымі абавязкамі ўдаецца спраўляцца дзевятнаццацігадовай Дашы, у якой хоць шлюб і не зарэгістраваны, тата дапамагае расціць малога. Акрамя таго, дзяўчыну фінансава падтрымліваюць «італьянскія бацькі», да якіх яна ездзіла, калі яшчэ жыла ў інтэрнаце. Усё ладзіцца ў 22-гадовай Наташы: яна змагла знайсці і працу, і мужа, разам з якім гадуе дзіця. У Марыі — наогул ужо трое чароўных дзетак і, нягледзячы на тое, што так складана падымаць пагодкаў, цудоўныя ўзаемаадносіны з мужам. Дзяўчаты сталі клапатлівымі, пяшчотнымі, любячымі мамамі.

Калі былыя выхаванцы інтэрнатаў дзеляцца марамі, аказваецца, што нават хлопчыкі хочуць сваю сям'ю. Прычым у планах з дзеткамі «пазначаюць»: «Зараз яшчэ рана, але праз годзік можна».

У голых сценах

Цэнтр тэрытарыяльнага абслугоўвання суправаджае сірот ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў. Інфармацыю пра сваіх падапечных сацыяльныя работнікі атрымліваюць яшчэ да таго, як хлопцы і дзяўчаты пакінуць дзіцячыя дамы ці інтэрнаты пры навучальных установах. Як правіла, з моманту набыцця сіроцкага статусу за дзецьмі замацоўваецца жыллё. Але бываюць і такія выпадкі, калі ім фактычна няма куды вяртацца. Напрыклад, калі бацькі, пазбаўленыя правоў, жылі ў інтэрнатах ці ў службовых кватэрах, месца за сіротамі не замацоўваецца. «Мы загадзя ўключаемся і спрабуем вырашаць падобныя пытанні. Што датычыцца атрымання сацыяльнага жылля — гэта справа, якая хутка не вырашаецца, тут патрэбны год і болей, — расказвае Юлія Кошкіна. — Часта сіроты вяртаюцца ў кватэры да сваіх пазбаўленых правоў бацькоў, з якіх нямногія за гэты час змяняюцца да лепшага. Так, адной з выхаванак інтэрната давялося сяліцца ў двухпакаёвую кватэру, дзе пражывала 9 чалавек, прычым тулілася дзяўчына ў адным пакоі з бабуляй і бацькам, які не перастаў піць. У пошуку выйсця сацработнікі нават дамовіліся з адзінокай бабуляй, якую абслугоўвае цэнтр, на тое, каб дзяўчынка часова пажыла ў яе. Але праблема вырашылася сама сабой — тату на год забралі ў ЛПП».

Калі раней сацыяльныя кватэры сіротам давалі ў новабудоўлях, то ў мінулым годзе гэта было другаснае жыллё. Часта ім даставаліся кватэры, папярэдніх жыльцоў з якіх выселілі за няўплату. Як правіла, жылплошча патрабавала сур'ёзнага рамонту, траплялася нават без сантэхнікі. І каб не падтрымка добрых людзей, многім сіротам давялося б пачынаць сваё жыццё ў голых сценах.

Раз у квартал сацыяльныя работнікі абвяшчаюць акцыі, у межах якіх адзінокай моладзі можна перадаць рэчы: спачатку патрэбна ўсё — ад відэльцаў і пасцельнай бялізны да мэблі. Званкоў паступае многа: людзі прапануюць разнастайную тэхніку, у тым ліку і буйную (халадзільнікі і пральныя машыны), шторы і карнізы, сталы і крэслы, шафы і паліцы. Сёння маецца патрэба ў дзіцячых рэчах, дзяўчатам, якія ў адзіночку спраўляюцца з немаўлятамі, неабходны каляскі, адзенне, дзіцячае харчаванне, падгузкі *(перадаваць дапамогу можна на Дзянісаўскую, 4, звязвацца па нумары 380-07-58)*.

Усё атрымаецца!

Трэба сказаць, што некаторыя выпускнікі дзіцячых інтэрнатаў да падобнай дапамогі ставяцца вельмі насцярожана. Рэдкія індывідуумы спекулююць на сваім статусе і носяцца з пасведчаннямі, каб выбіць для сябе нейкія даброты. У большасці маладыя людзі нават у размовах імкнуцца пазбягаць свайго сіроцкага мінулага, быццам саромеюцца яго.

Маці схіляла дачку зрабіць аборт. Але атрымала адказ: «Я не буду такой, як ты, нараджу дзіця і выхаваю!»

Прышчэпка пладовых дрэў	13, 18, 19.	10, 17	5, 14-16, 19, 24, 28, 29	1-3, 9-10, 14, 15, 23, 27, 28	7-9, 17, 18, 22, 26-29	3-5, 11-13, 21-23, 27-29	10, 17, 19, 24, 28-29	-	-	-	-	
Прышчыпванне растучых верхавінак раслін	-	-	4, 6, 14-16, 23-24, 29	2, 3, 10, 14, 23, 28	8, 9, 17-19, 22, 27, 29	4, 5, 12, 13, 22, 25, 28-30	1, 2, 10, 19, 25, 26, 29	-	-	-	-	
Пасадка і перасадка пакаёвых раслін	7-9, 15-17, 26-27	2-4, 12-14, 22, 24, 28	3-4, 10, 11, 20-23, 25, 26, 30, 31	7-9, 15-18, 23, 27-29	4-7, 13-15, 20, 24, 28	1-3, 9-10, 21-24, 28, 30	7-10, 14, 17-19, 25-27, 31	4-6, 12-14, 22-24, 30, 31	1, 2, 10, 18, 19, 21, 28, 29	1, 6, 7, 12, 15-16, 21, 22, 24, 30, 31	2, 3, 7, 11-13, 20-23, 27-28	1, 8-10, 17, 19-21, 28-30
Пасадка і перасадка клубневых культур	8-9, 17-18, 27	4, 12, 24, 28	4, 11, 21-24, 26, 30, 31	1-4, 15, 16, 22, 24, 28, 29	1-5, 11-14, 23, 28-30	2, 3, 7, 10, 19-21, 28, 29	2-4, 8-10, 19, 27, 31	1, 3, 9, 22, 24, 25, 30, 31	1, 3, 10-12, 19, 28, 29	6, 7, 13, 14, 21, 24, 30	2, 3, 11, 12, 20, 21, 27	1, 2, 9, 19, 20, 28, 29
Пасадка расады	2-4, 7-10, 14-17, 25, 30, 31	2-4, 14-15, 21, 24, 28	2-4, 10-12, 21-24, 26, 30, 31	1, 3, 7, 15, 16, 23, 27, 28, 30	-	-	-	-	-	-	-	
Выган цыбулі на зяленіва	4, 11, 20, 21, 20, 31	4, 7, 8, 16, 17, 23, 27	4, 10, 20-23, 30	3, 4, 12-14, 27, 30	1, 9, 11, 15, 19-21, 27-29, 31	4-7, 15-18, 25-27	3, 4, 14, 15, 18, 25, 27, 30	1, 9, 10, 20, 24, 28	5-7, 16, 25-27	3, 4, 6, 13-14, 18, 23, 28, 29	1-3, 7, 8, 19, 24, 25	2-4, 8, 11-13, 21, 22, 27, 30
Рэвізія насення	1-3, 9-10, 17-18, 27, 31	7, 10, 14, 15, 20-22, 27, 28	1, 3, 11, 14, 22, 29, 31	-	-	-	-	-	3-5, 16, 23-24, 29-30	-	-	-
Праразджванне ўсходаў	-	5, 6, 14, 20, 24, 25	5, 11, 13-15, 19, 22, 29, 31	1-3, 9, 10, 18-20, 23, 25, 28-30	7-9, 13, 17-19, 26-29	3-5, 12-15, 23, 28-30	1-3, 10, 11, 19, 20, 25, 28, 29	-	-	-	-	-
Прышчэпка, у тым ліку акуліроўка (вочкамі)	-	14, 24, 28	2, 4, 5, 14-16, 22-24, 29, 30	1-3, 10, 1-16, 23, 28, 30	7, 8, 17-19, 22, 26-30	2, 8, 9, 17-19, 22, 25, 28, 30	10-12, 17, 24, 28, 30	-	-	-	-	-
Апырскванне супраць хвароб	20-21	1, 15, 16, 25	8-10, 16-18, 24, 29	1-3, 12-14, 18-19, 25, 29	1-3, 8, 9, 11, 20-23, 30, 31	5, 6, 9, 10, 18-20, 28-30	2, 3, 13, , 14, 22, 24, 30,	1, 11, 17-20, 25-27, 29, 30	7, 8, 15, 16, 23-25, 30	6, 12-14, 20-22, 26, 30, 31	-	-
Пасынкаванне (выдаленне лішніх парасткаў)	9-10, 20-23	15-17, 23, 25	1, 6, 16-18, 22, 23, 27, 30	2, 3, 12, 13, 19, 26-29	6-8, 14, 17, 18, 26, 28-30	1-3, 11-14, 19, 22, 29-30	1-3, 11-13, 18-19, 22, 25-27, 30	3, 8, 9, 20, 28-30	-	-	-	-
Пікіроўка раслін (выдаленне часткі стрыжнёвага кораня)	4-6, 13-14, 24-26	3, 11, 17, 22	5, 10, 11, 19, 20, 24, 29	5-7, 15-17, 23, 27, 30	3, 4, 12-15, 24, 29, 30	1, 2, 9, 10, 18-21, 28, 30	7-8, 16-17, 24	4-6, 18-20	-	-	-	-
Абрэзка сухіх галін	2-4, 9, 18-19, 27	1, 7, 11, 20, 25	4, 6, 14, 23, 29	1-3, 10-13, 25, 29	7-9, 17, 21, 30, 31	3, 13, 14, 23, 26, 27	2, 10-12, 28-30	7-9, 16-19, 29	1-4, 16, 17, 19, 25, 27, 30	1-3, 17-20, 28, 29	-	-
Збор збожжавых	-	-	-	-	-	-	17-19, 24-27	2-4, 15-17, 24-27, 30	1, 2, 6-8, 21-24, 26-29	-	-	-
Збор караняплодаў	-	-	-	-	-	1, 2, 10, 19-21, 28, 29	8-10, 17, 21, 25-27	4, 5, 12-14, 22-27	1, 2, 14-16, 18-19, 28-30	-	-	-
Збор садавіны для захоўвання	-	-	-	-	-	3, 8-9, 18, 27-28	4-7, 15, 22, 28-30	1-3, 5, 11, 12, 19, 25, 28-30	3-5, 12-15, 17, 19, 24-30	-	-	-
Зрэзка кветак	-	-	-	-	-	3, 8-9, 14, 18, 26-28	5-7, 15, 28-29	2, 3, 11-13, 19, 21, 28-30	1, 3, 8, 16-17, 19, 25-27, 30	-	-	-
Уборка агародніны	-	-	-	-	-	1-3, 11-13, 22, 23, 27-28	1, 3, 10, 15-17, 24, 30	5-7, 18-20, 26-30	2-4, 8-10, 16, 17, 21-23, 29, 30	-	6-9, 23-27	2, 7, 8, 11-13, 18-20, 22, 30, 31
Укрыццё раслін і ахова ад халадоў	5-7, 20- 23, 27-29	-	-	-	-	-	-	-				

■ З нагоды

Экалагічны летапіс краіны

Часопісу «Родная прырода» — 45 гадоў

1972 год. Апошняе лета майго дзяцінства. Бывайце балотца за мілай ваколіцай, грыбны лясок, любая вёска, бывайце... Развітваюся з бабуляй, у горадзе іду ў першы клас. Наперадзе новае, нязведанае, але такое захапляльнае жыццё. Як вядома, многае з цягам імклівага часу пераасэнсоўваецца па-іншаму. І цяпер з вышыні дарослага чалавека, прафесійнага журналіста, пісьменніка, лаўлю сябе на думцы, чаму значную частку сваёй творчасці прысвячаю менавіта ёй, беларускай прыродзе? Працяглы час была непарыўна звязана з лясной галіной, і вось зараз лёс зноў звёў, не пабаюся высокага слова, з беларускім брэндам — часопісам «Родная прырода».

Сама сябе пераконваю ў тым, наколькі важныя для чалавека яго жыццёвыя карані, калі яны знітаваны з пахам цёплай зямлі, смакам сонечнай антонаўкі, адчуваннем подыху лёгкага ветрыку... Каб лепш разумець, хто ты ёсць у гэтым свеце, трэба ў пэўным сэнсе гэтага слова з'яднацца з прыродай. Яна дужыць пры любых абставінах, не дае схіліцца ад жыццёвых бур...

1972 год. Знаходжу цікавую адметнасць у жыцці нашай краіны — у Мінску зарэгістраваны мільёны жыхар. Думаю, чалавек настойліва імкнецца да цывілізацыі. Спакуслівыя гарадскія выгоды вабяць з вёскі ў сталіцу моладзь. Я зусім не за тое, каб рабіць нейкія папрокі. Чалавек мае права выбіраць тое, што яму падабаецца. І мой лад жыцця стаў гарадскім. Але ж ці не занадта мы аддаляемся ад таго, што стварае сутнасць чалавека, узвышае яго душу — непасрэднай блізкасці з прыродай? Чаму пасля гарадскога тлуму так хочацца ўдыхнуць глыток свежага паветра, прытуліцца да беластвол бярозкі, падзівіцца легкакрыламу матыльку?..

1972 год. Пачынае адлік свайго доўгага творчага шляху часопіс «Родная прырода». Сказаць толькі творчага, напэўна, будзе памылкова. І гэта нягледзячы на тое, што ўсе гады старонкі выдання напоўнены лірызмам, узнёсласцю пачуццяў, на якія можа натхніць толькі яна, наша родная беларуская прырода. Сутнасць часопіса больш глыбокая. Яго філасофія якраз і крыецца ў той галоўнай сутнасці: чалавек — ты часцінка прыроды. Не нашкодзь ёй, не пакрыўдзі, не згубі!..

Старонкі складаюцца ў нумары, нумары ў падшыўкі. За 45 гадоў створана сапраўдная экалагічная бібліятэка. А гэта ж усяго толькі адно выданне!

З нумара ў нумар відавочна не толькі прыродаахоўная тэматыка. За створаным пакаленнямі журналістаў экалагічным летапісам стаіць больш значнае — лёс цэлай краіны. Бо што б ні рабіў чалавек: выпрамляў рэкі, асушваў балоты, выпускаў з-пад улады смяротны атам, пакутавала прырода. І рэхам экалагічныя беды адгукаліся ў пранікнёных журналісцкіх радках, знаходзілі ўвасабленне ў набалелых тэмах на старонках «Роднай прыроды».

Сучасны часопіс, нягледзячы на свой «глянцавы» выгляд, гэткі ж непахісны абаронца роднай прыроды, як і тыя яго першапачаткоўцы з цяпер ужо далёкіх 1970-х. Калі гаварыць пра тое, што радуе асабліва цяперашніх стваральнікаў часопіса, дык гэта сябры-падпісчыкі. Нашы паплечнікі і ўсе тыя грамадскія актывісты і проста неабыякавыя людзі, якія экалагічныя праблемы лічаць за свае і робяць усё для таго, каб свет вакол нас стаў чысцейшым і дабрэйшым. І, зразумела, асабліва ўдзячнасць Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь за тую стваральную дзяржаўную экалагічную палітыку на карысць захавання і прымнажэння прыродных багацця Беларусі. І мы, стваральнікі часопіса, зразумела, да гэтага яшчэ больш далучымся, каб не страцілася наша, роднае...

Алена СТЭЛЬМАХ,
галоўны рэдактар часопіса «Родная прырода»

■ Зялёная аптэка

САСНА — СКАРБОНКА ВІТАМІНАЎ ЗІМОЙ

Некаторыя навукоўцы сцвярджаюць, што многія вітаміны з гародніны і садавіны знікаюць ужо праз тры месяцы пасля таго, як іх пазбавілі мацярынскага падсілкоўвання (г.зн. сарвалі з дрэва або выкапалі з зямлі). А што ж узімку?

Прырода ўсё прадугледзела і не пакінула нас у бядзе. У паўночных краях растуць вечназялёныя дрэвы і хмызнякі. Гэта — хвоі, елкі, ядловец. Іх іголкі (перайначанае лісце) зімой утрымліваюць у сабе вітаміну С нават больш, чым улетку. Утрымліваюць усе віды хваёвых дрэў і вітаміны групы В (B_1, B_2), К, Р, правітамін А (каратын), шматлікія мікраэлементы і іншыя карысныя для чалавека рэчывы (эфірны алей, смалу, таніды).

У цяжкія дні блакады Ленінграда была арганізавана масавая вытворчасць хвойнага напою, які выратаваў жыццё многім людзям. Бо ўстаноўлена, што ў шклянцы хвойнага напою столькі ж вітаміну С, колькі ў шклянцы лімоннага і таматнага соку.

Падчас вайны хвойны напой ужывалі і салдаты, якія трапілі ў акружэнне, і параненыя ў шпіталях, і партызаны, і выхаванцы дзіцячых дамоў.

Каб прыгатаваць гэты напой, бяруць шклянку здробненай ігліцы, расціраюць яе ў ступцы, заліваюць 0,5 л халоднай гатаванай вады, настойваюць 1—2 сутак, працэджваюць і выпіваюць увесь атрыманы аб'ём вадкасці малымі порцыямі за двое сутак. Добра дадаваць у гэты напой трошкі журавінавага або яблычнага соку (чайную лыжку ў шклянку настою) ці ўжываць упрыкуску з 1 чайнай лыжкай мёду. Толькі варта мець на ўвазе, што галінкі са свежай ігліцай, якія ляжаць у снезе, захоўваюць вітамін С на працягу трох месяцаў, а тыя, што знаходзяцца ў пакоі, пачынаюць губляць вітаміны ўжо на трэція суткі.

Усім вядома, што хвоя, елка, ядловец ачышчаюць паветра ад шкодных газаў, пылу, небяспечных мікраарганізмаў і насычаюць яго карыснымі фітанцыдамі, духмянымі эфірамі. Не дзіва, што менавіта ў хваёвых барах будуюць санаторыі для хворых на сухоты.

Фармацэўтычная прамысловасць вырабляе з хвоі шэраг прэпаратаў, якія выкарыстоўваюцца пры лячэнні многіх захворванняў. А я прапаную шаноўным чытачам рэцэпт сасновага мёду: 1 кг пупышак, абавязкова сабраных у красавіку, заліць 3 л кіпеню, варыць на малым агні паўгадзіны. Дадаць 3 кг цукру, яшчэ варыць 3—5 хвілін і ў цёплым выглядзе разліць у чыстыя сухія слоікі. Прымаць па 1 чайнай лыжцы з гарбатай на працягу аднаго тыдня пры прастудных захворваннях.

Жадаю ўсім добрага здароўя!

Лідзія НАВІЧЫХІНА, трававед

«САЛЁНАЯ» ЗІМА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

«У сезон 2016—2017 гадоў для барацьбы з зімовай слізкасцю выкарыстоўваюцца традыцыйныя процігалалёдныя рэагенты на аснове галіту (соль для тэхнічнага выкарыстання). На сённяшні дзень эканамічны складнік і эфектыўнасць рэагенту — самыя важкія аргументы пры выбары матэрыялаў для апрацоўкі пакрыццяў, — растлумачыў **намеснік генеральнага дырэктара па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Анатоль ЖАМОЗДЗІК.** — Ужыванне гэтых матэрыялаў абумоўлена тым, што ў краіне ёсць значныя радовішчы солі, якая з'яўляецца самым танным і найбольш эфектыўным матэрыялам для барацьбы з зімовай слізкасцю».

У многіх мінчан існуе меркаванне, што вулічна-дарожную сетку пасыпаюць нечым вельмі небяспечным і забароненым. Па словах Анатоля Жамоздзіка, забароненыя рэчывы ў процігалалёдных сумесях не выкарыстоўваюцца.

Усе прадпрыемствы-ўдзельнікі аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» выкарыстоўваюць процігалалёдныя матэрыялы, дазволеныя да ўжывання, якія адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўна-прававых актаў і вырабляюцца па тэхналагічных рэгламентах і рэцэптурах.

Для ліквідацыі зімовай слізкасці ўжываюць хімічны, хіміка-фрыкцыйны і фрыкцыйны спосабы. Пры хімічным спосабе выкарыстоўваюць цвёрдыя крышталічныя процігалалёдныя матэрыялы на аснове хларыстага натрыю з утрыманнем апошняга ад 95%. Хіміка-фрыкцыйны спосаб прадугледжвае змешванне цвёрдых крышталічных матэрыялаў з пяском у аб'ёме, неабходным для размеркавання хімічных складнікаў. Канцэнтрацыя рэагенту ў такіх сумесях вагаецца ад 5% да 95%. Фрыкцыйныя матэрыялы прымяняюцца для павышэння счэпных якасцяў пры наяўнасці на пакрыцці снежна-ледзянога накату і іншых утварэнняў. Колькасць рэагенту ў такіх сумесях не перавышае 5%.

А як соль уплывае на глебу, на дрэвы, кусты? Ці задаецца хтосьці гэтым пытаннем? «Для памяншэння адмоўнага ўздзеяння рэагентаў на навакольнае асяроддзе арганізацыі, якія выконваюць работы па зімовым утрыманні дарог, дакладна выконваюць нормы россыпу рэагенту, шырока ўжываюць прафілактычную апрацоўку пакрыццяў з мінімальнымі нормамі размеркавання сумесі, — растлумачыў Анатоль Жамоздзік. — Захоўванне і складаванне матэрыялаў ажыццяўляецца на пляцоўках з асфальтабетонным пакрыццём, з правядзеннем мерапрыемстваў, якія выключаюць прасочванне раствораў у глебу. Захоўванне рэагентаў у чыстым выглядзе забяспечана ў закрытых складах».

Меркаванне эколага

— Немагчыма дакладна ацаніць шкоду, якая наносіцца прыродзе, калі невядома, дзе і колькі солі патрапіла ў глебу. Такіх даследаванняў няма, — адзначае **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ. —** Безумоўна, выкарыстанне пясчана-салянай сумесі мяняе водна-салявы рэжым глебы і негатыўна ўплывае на расліннае покрыва газонаў, зялёныя насаджэнні, таму ў такіх месцах вельмі пажадана абмежаваць выкарыстанне солі. У зімовы перыяд трэба асабліва ўважліва шукаць месца для прагулак з дамашнімі гадаванцамі — лапы катоў ды сабак баляць ад дотыку да процігалалёдных рэагентаў.

Вельмі важна, каб пясчана-саляныя сумесі выкарыстоўваліся ва ўмеранай колькасці, не перавышалі дапушчальныя нормы. Адзначу, што ў Мінску былі спробы прымяняць іншыя рэагенты, але ў выніку вярнуліся да традыцыйных матэрыялаў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

■ У свеце жывёл

Як зубры сталі зоркамі інтэрнэту

Нядаўна ў сацыяльныя сеткі трапіла хвіліннае відэа з камер назірання, размешчаных на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў Польшчы (Zubry Online), з подпісам «Ваўкі, якія вырашылі напасці на зуброў, ледзьве ўцяклі!». Адразу звяртаем увагу на памылковасць назвы: ваўкі на відэа не нападалі на зуброў, а зусім наадварот.

Па словах **Аляксея БУНЕВІЧА, кандыдата біялагічных навук, вядучага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага парку «Белавежская пушча»,** такая буйная здабыча, як зубр, ваўку не па зубах. Зграя ваўкоў прыйшла на месца «падкормкі» капытных (у кадры бачна кармушка), гэта звычайна для драпежнікаў. Хутчэй за ўсё, шэрыя проста абыходзілі свае «пункты», спадзяваліся сустрэць аленяў ці іншую больш дробную здабычу.

Зграя ваўкоў (не менш за 5—8 асобін) здольная нападаць толькі на хворых, старых зуброў, якія адыходзяць ад статка, ці на зубраня без маці, але гэта рэдкія, адзінкавыя выпадкі. Ваўкі добра ведаюць, што зубры не бягуць ад драпежнікаў, а нападаюць, абараняючы статак, і не адважваюцца на атаку. Таму назва відэа мае на мэце толькі ўзбудзіць інтарэс абывацеляў і набраць больш «лайкаў». Да рэальных падзей яна не мае ніякага дачынення.

Аляксей Мікалаевіч пракаментаваў і нядаўні выпадак з маладым 5-гадовым зубром, які пакінуў пушчу ў пошуках самкі і «прыбіўся» да статка кароў у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці. Ролік праглядзелі больш за 16 тысяч інтэрнэт-карыстальнікаў. Гэта прыклад незвычайных паводзін жывёлы, які прыцягнуў увагу людзей: зубры, калі і патрапяць на статак, б'юцца з быком і могуць параніць кароў. Малады ж зубр паводзіў сябе спакойна, мірна пасвіўся разам з астатнімі. Пасля звароту з мясцовай гаспадаркі супрацоўнікі Белавежскай пушчы забралі Борку, так назвалі пушчанскага ўцекача, і змясцілі ў вальер да трох самак (у якіх нядаўна загінуў самец). Зараз ён добра сябе адчувае і збягаць з Белавежскай пушчы больш не збіраецца. Прымаючы да ўвагі нетыповыя паводзіны зубра, у вальеры ён правядзе не адзін год.

Вольга ПРАЛЮК. *pralyuk@zviazda.by*

АСКЕПКІ ВОСТРАВА

Ці ўдасца Кіпру ўрэшце стаць адзінай дзяржавай?

Кіпр зноў у «топе» стужак навін сусветных інфармагенцтваў. На мінулым тыдні ўсе чакалі, што адбудзецца насамрэч гістарычная падзея, аднак міжнародная канферэнцыя ўз'яднання грэчаскай і турэцкай частак Кіпра ў Жэневе завяршылася безвынікова. У прадстаўнічым форуме, які праходзіў пад старшынствам Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша, таксама ўдзельнічалі прэзідэнт Рэспублікі Кіпр Нікас Анастасіадзіс, лідар турэцкай абшчыны вострава Мустафа Акынджы, кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер і кіраўнік еўрапейскай дыпламатыі Федэрыка Магерыні. Разам з кіраўніком МЗС Вялікабрытаніі Барысам Джонсанам на перамовы прыбылі яго калегі — Нікас Катзіас з Грэцыі і Меўлют Чавушаглу з Турцыі. Як вядома, гэтыя краіны з'яўляюцца гарантамі балансу сіл на востраве.



Цяпер работа будзе працягнута на экспертным узроўні. «Спачатку прадстаўнікі ўсіх бакоў сустрэнуцца 18 студзеня», — заявіў прадстаўнік урада Рэспублікі Кіпр Нікас Хрыстадулідзіс. Па словах Нікаса Катзіаса, група экспертаў павінна прадставіць даклад аб узбраенні і колькасці войскаў, дыслакаваных на востраве, — як грэчаскіх, так і турэцкіх. Пасля чаго перамовы могуць аднавіцца 23 студзеня. Ці ўдасца ў выніку стварыць на Кіпры адзіную дзяржаву?

Справа «чорных палкоўнікаў»

Дзве абшчыны — грэчаская і турэцкая — на Кіпры жывуць побач ужо вельмі даўно. У XVI стагоддзі, пасля таго як Асманская імперыя захапіла востраў у ранейшых гаспадароў — венецыянцаў, султан Сялім II перасяліў сюды тысячы сваіх падданых з Малой Азіі. З тых часоў грэкі і туркі жылі побач, практычна не змешваючыся.

Праблема падзелу вострава паўстала адразу пасля прадастаўлення яму ў 1960 годзе незалежнасці ад Вялікабрытаніі. Абраны прэзідэнтам Кіпра архіепіскап Макарый першапачаткова падтрымліваўся грэчаскімі нацыяналістамі, якія неўзабаве пачалі дамагацца далучэння вострава да Грэцыі. Паралельна Анкара спрабавала ўмешвацца ў справы Нікасіі, баючыся пераследу турэцкай меншасці. У ліпені 1974 года грэчаскаму ўраду «чорных палкоўнікаў» удалося зрынуць Макарыя і ўсталяваць на востраве ўладу ірэдэнтыстаў — прыхільнікаў аб'яднання з Грэцыяй. Праз тыдзень Турцыя пачала ваенную інтэрвенцыю на востраў, матывуючы гэта апасеннямі за жыццё туркаў-кіпрыётаў.

Пагроза ваенна-палітычнага крызісу прывяла да адхілення ад улады ў Грэцыі «чорных палкоўнікаў». Скарыстаўшыся сітуацыяй, Анкара абвясціла на поўначы Кіпра дзяржаву, якая пасля была названа Турэцкай рэспублікай Паўночнага Кіпра (ТРПК). З дзяржаў — членаў ААН толькі Турцыя прызнае незалежнасць ТРПК.

Перамовы аб аб'яднанні дзвюх частак вострава з рознай ступенню інтэнсіўнасці ідуць з 1974 года (першы іх раўнд адбыўся ў Жэневе праз некалькі дзён пасля турэцкага ўварвання). Апошняя сур'ёзная спроба вырашыць праблему адбылася ў 2004-м, калі тагачасны Генеральны сакратар ААН Кофі Анан прапанаваў стварыць адзіную рэспубліку з дзвюх аўтаномій з грэка-турэцкім прэзідыумам на чале. Аднак на рэферэндуме 75% грэкаў-кіпрыётаў выказаліся супраць прапановы, паколькі там не прапісвалася неабходнасць вываду з ТРПК турэцкіх войскаў.

Больш за 40 гадоў востраў лічыцца падзеленым напалам, хоць насамрэч кантралюючых бакоў на тэрыторыі больш. Гэта Рэспубліка Кіпр, населеная пераважна грэкамі, Турэцкая рэспубліка Паўночнага Кіпра, а таксама дэмаркацыйная паласа пад кантролем ААН і дзве вайсковыя базы, якія маюць статус заморскіх тэрыторый Вялікабрытаніі.

Паабапал «зялёнай лініі»

Да гэтага часу на так званай зялёнай лініі, якая падзяляе востраў, знаходзіцца кантынгент узброеных сіл Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па падтрыманні міру на Кіпры, мандат якога падаўжаецца з году ў год. У цэлым ААН абстаноўку на Кіпры лічыць стабільнай. Мясцовыя жыхары могуць свабодна пераходзіць «зялёную лінію», хай і на абмежаваны час, а на грэчаскай частцы вострава спакойна існуюць турэцкія абшчыны.

На поўначы Кіпра сітуацыя складаная. На турэцкі сектар прыпадае 20 працэнтаў насельніцтва і 10 працэнтаў ВУП у параўнанні з грэчаскай часткай вострава. У Паўночны Кіпр не паступаюць замежныя інвестыцыі. Тэрыторыя выжывае шмат у чым дзякуючы датацыям Турцыі. У Рэспубліцы Кіпр устойлівая эканоміка, развіты фінансавы сектар, пятую частку паступленняў забяспечвае турызм. У 1998—2008 гадах тут адбыўся сапраўдны інвестыцыйны «бум», звязаны з актыўным паступленнем афшорнага капіталу.

На поўначы сапернічаюць дзве найбуйнейшыя палітычныя сілы. Адна з іх — Партыя нацыянальнага адзінства (ПНА), створаная яшчэ ў кастрычніку 1975-га, якая выступае за максімальнае збліжэнне з Турцыяй і прыцягненне капіталаў гэтай краіны. Ёй супрацьстаіць левая Рэспубліканская турэцкая партыя, якая настойвала на стварэнні адзінай дзяржавы і якую падтрымлівае ў гэтым пытанні цэнтрысцкая Дэмакратычная партыя. У апошнія гады адносіны двух Кіпраў былі досыць халаднаватымі: у крэсле прэзідэнта ТРПК знаходзіўся прадстаўнік ПНА Дэрвіш Эраглу, якога грэкі лічылі недагавораздольным.

У 2014 годзе бакі не змаглі дамовіцца аб распрацоўцы радовішчаў вуглевадародаў на шэльфе Паўночнага Кіпра, пасля чаго дыялог быў канчаткова згорнуты. Перамовы аднавіліся пасля таго, як на выбарах у красавіку 2015-га перамог незалежны кандыдат Мустафа Акынджы. Гэты палітык вядомы левымі поглядамі і абяцаў вырашыць праблему з аб'яднаннем на працягу свайго прэзідэнцкага тэрміну — за пяць гадоў. Ён выступае супраць празмернай апекі з боку Турцыі, хоць і не гатовы псаваць адносіны з Анкарой. Акынджы нават выказаў гатоўнасць перадаць грэкам памежны горад Варошу, адкуль усе жыхары збеглі яшчэ ў 1974 годзе. У Рэспубліцы Кіпр абранне ўспрынялі пазітыўна. Падставы для аптымізму дае тое, што на пасадзе мэра Лефкошы (турэцкай часткі Нікасіі) Акынджы выдатна спрацаваўся з грэчаскімі калегамі, а пазней, ужо на пасадзе віцэ-прэм'ера і міністра турызму, заслужыў рэпутацыю актыўнага прыхільніка дружбы з поўднем.

Гульцы з інтарэсамі

Як заўважаюць эксперты, сітуацыя на Кіпры ўнікальная для Еўрапейскага саюза: іншых расколатых дзяржаў у гэтым аб'яднанні няма. Паўночны Кіпр фармальна ўваходзіць у ЕС, таму што займае частку тэрыторыі вострава, раскол якога на дзве дзяржавы Еўрасаюз не прызнае. Да гонару еўрапейскіх інстытутаў варта заўважыць, што над уладжваннем кіпрскага канфлікту яны працавалі доўгія гады, імкнучыся дзейнічаць максімальна акуратна.

Апроч Афін, Анкары і Бруселя, свае інтарэсы да расколатага вострава маюць шэраг міжнародных гульцоў. Былая метраполія Кіпра — Брытанія —- актыўна дзейнічае ў ключавым раёне Усходняга Міжземнамор'я, на мяжы Еўропы і Азіі (да якой, дарэчы, востраў адносіцца геаграфічна). Пасля абвяшчэння кіпрскай незалежнасці Вялікабрытанія захавала сваю юрысдыкцыю над дзвюма вайсковымі базамі. Яны займаюць каля 3% ад усёй тэрыторыі вострава — 254 кв. кіламетры, прычым толькі 60% зямлі ў гэтых зонах знаходзіцца ў прыватным валоданні брытанцаў і грэкаў-кіпрыётаў. Астатняя тэрыторыя належыць непасрэдна міністэрству абароны Вялікабрытаніі.

Свае планы па «ўрэгуляванні» сітуацыі на Кіпры, вядома, ёсць і ў ЗША. Менавіта з гэтай мэтай у красавіку мінулага года востраў наведала прадстаўніца Дзярждэпа, тагачасны памочнік дзяржсакратара па справах Еўропы і Еўразіі Вікторыя Нуланд. Відавочна, што амерыканская дыпламатыя рыхтуецца ажыццявіць тут сцэнарый, які забівае некалькіх «зайцоў» адразу: уцягванне вострава ў НАТА, членам якога, нагадаем, з'яўляецца Турцыя.

На шляху да федэрацыі

Ідэальнае рашэнне міжнародныя назіральнікі, як канстатуе Бі-бі-сі, бачаць у аб'яднаным, але федэратыўным Кіпры, дзе ўлада была б размеркавана пароўну паміж кіраўніцтвам абшчын грэчаскіх і турэцкіх кіпрыётаў. Аднак на шляху працэсу нармалізацыі стаіць шэраг праблем, якія дасюль застаюцца даволі адчувальнымі для абодвух бакоў. Першай на парадку дня перамоваў паўстае праблема маёмасці, якая належала грэкам-кіпрыётам да турэцкага ўварвання ў 1974 годзе. Не вырашана пытанне, аддаваць яе колішнім гаспадарам або выплачваць ім грашовую кампенсацыю.

Не менш важнай праблемай можна лічыць тое, хто будзе адказным за бяспеку на поўначы Кіпра, дзе цяпер знаходзіцца каля 30 тыс. турэцкіх вайскоўцаў. Днямі прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заявіў, што пытанне аб поўным вывадзе турэцкіх войскаў з тэрыторыі падзеленага Кіпра пакуль не абмяркоўваецца. Раней прэзідэнт Рэспублікі Кіпр Нікас Анастасіадзіс падкрэсліў: любое пагадненне аб аб'яднанні вострава павінна прадугледжваць вывад войскаў.

Бакам таксама неабходна ўзгадніць механізм змены прэзідэнтаў Кіпра. Яшчэ адзін праблемны пункт: хто стане гарантам рэалізацыі дасягнутых пагадненняў на ўзроўні міжнародных пасярэднікаў. Неабходна памятаць, што ўмовы здзелкі павінны быць вынесены на народныя рэферэндумы ў дзвюх частках вострава. І не факт, што яны будуць паспяховымі.

Эксперты не выключаюць, што Турцыя, якая доўгі час была непахісная ў пытанні з Паўночным Кіпрам, цяпер можа змяніць гнеў на літасць, улічваючы цяжкае міжнароднае становішча, у якім яна апынулася. Кіраўнік МЗС Турцыі Меўлют Чавушаглу аптымістычна настроены ў дачыненні да перамоў па Кіпры. «Мы не расчараваныя, — адзначыў ён. — За адзін дзень нельга атрымаць выніку. Гэта нялёгкае пытанне».

На думку загадчыка сектара даследаванняў Еўрасаюза Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН Юрыя Квашніна, у выпадку поспеху перамоваў не варта разлічваць на неадкладнае ўтварэнне адзінай кіпрскай дзяржавы. «Нават калі перамовы будуць паспяховымі, гаворка ідзе пра тое, каб у перспектыве стварыць «дарожную карту», — мяркуе эксперт. — Цяпер кажуць пра федэрацыі, але гэта будзе відавочна не дзяржаўнае ўтварэнне, аналагічнае ФРГ і Расійскай Федэрацыі, ступень аўтаноміі розных частак вострава будзе значна вышэйшай. Прывесці ўсе да агульнай асновы будзе вельмі складана».

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш адзначыў, што з аптымізмам глядзіць на перспектыву дасягнення грэчаскай і турэцкай абшчынамі Кіпра пагаднення па аб'яднанні краіны. Пры гэтым ён прызнаў, што цуду «хутчэйшага ўрэгулявання» кіпрскай праблемы не адбудзецца. Гутэрыш адзначыў, што галоўная мэта складаецца не ў як мага больш хуткім урэгуляванні праблемы, а ў пошуках надзейнага і доўгатэрміновага яе вырашэння. Вядома, разбураць лягчэй, чым пасля збіраць.

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

КУРОРТНЫ РАМАН ЯНКІ КУПАЛЫ

Яго каханая была маладзейшай амаль на 30 гадоў

Наш пясняр Янка Купала меў свае слабасці і быў неабыякавы да прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва. На працягу некалькіх гадоў ён сустракаўся з каханай дзяўчынай у Грузіі. Прыгажуня Эліко стала музай паэта і натхніла на многія выдатныя творы.

«Сэрца маё, жыццё маё»

На курорце ў Цхалтуба Купала бываў з 1937 па 1941 год. Менавіта там ён сустрэў Эліко Метэхелі, якая працавала галоўным урачом. Купалу на той час было 55 гадоў, а Метэхелі — 26. «Вядома ж, яна пакарыла паэта сваёй маладосцю і прыгажосцю. А паэт яе — пэўна ж, вершамі, да таго ж ён быў цікавым мужчынам», — упэўнена Марына Падгурская-Кутатэладзэ, якая днямі завітала з Грузіі ў Літаратурны музей Янкі Купалы ў Мінску.

Пара сустракалася падчас прыездаў беларускага песняра ў Цхалтуба (у Мінску яго чакала жонка), а ў іншы час яны перапісваліся. Калі Купала пытаўся ў сяброў, як перакладаецца «генацвале», яны адказвалі яму, што дакладнага тлумачэння няма, яно можа азначаць «каханая, дарагая, сэрца маё, жыццё маё». На гэта паэт адказаў: «Тады я ведаю, што генацвале мяне чакае ў Цхалтуба».

Па ўспамінах некаторых сучаснікаў, Метэхелі не вылучалася надзвычайнай прыгажосцю. Але яна была вельмі прыемнай і абаяльнай жанчынай, да таго ж шыкоўна спявала грузінскія песні. Як характарызавала такі раман з беларусам яе сяброўка: «У іх была платанічная любоў».

Пазней гэта грузінская дзяўчына вельмі ўдала выйшла замуж. Яе муж быў другім чалавекам у Грузіі — фактычна, адным з кіраўнікоў краіны. У іх нарадзіліся дзеці.

Якуб Колас, Эліко Метэхелі, Янка Купала, Марат Індзюкоў (хлопчык). Цхалтуба, 1941 год.

Адметна, што трое ўнукаў Метэхелі і сёння выдатна валодаюць беларускай мовай. Яны чытаюць вершы па-беларуску і кажуць, што Янка Купала быў іх дзядулем, што яны выраслі на гэтым творцы. Для іх сям'і Янка Купала — родны чалавек.

Кватэру Метэхелі ў Тбілісі ўнукі захавалі як своеасаблівы сямейны музей. Яе можна наведаць, убачыць там фотаздымкі. Захаваліся картачкі, што сведчаць пра гэты беларуска-грузінскі раман, успаміны ўнукаў, вельмі шмат лістоў, якія Купала слаў сваёй каханай. Пазней наш пясняр напіша: «Будуць сніцца скалы, горы, Грузіі цудоўнай далі».

Купала казаў, што спатрэбілася некалькі гадоў, каб пераасэнсаваць усе тыя ўражанні, якія ў яго засталіся пасля Грузіі. І яны натхнілі яго на некалькі яскравых твораў.

Беларускі куток на грузінскім курорце

Даведаўшыся пра тыя сувязі, якія яднаюць беларускага песняра з грузінскай зямлёй, уладальніца гасцявога дома ў Цхалтуба Марына Падгурская-Кутатэладзэ вырашыла стварыць у сябе невялікую музейную экспазіцыю, прысвечаную Купалу. Яна адзначае:

— Купала — гэта пясняр беларусаў. А ў грузінаў ёсць свой пясняр — Ілья Чаўчавадзэ. І вось мы іх параўноўваем. Я заўсёды кажу, што Купала для беларусаў — тое ж, што Чаўчавадзэ для грузінаў — і тады ўсё робіцца зразумелым. У нас нечым родныя душы. Сам Янка пісаў, што ў нас шмат блізкага — напрыклад, любоў да зямлі. Да таго ж грузінская саламуры і беларуская жалейка маюць аднолькавае гучанне... Калі я даведалася, што Купала адпачываў у Грузіі, вельмі зацікавілася і адразу вырашыла ў нас зрабіць выставу з гэтай нагоды. Знайшла аднадумцаў-дзяўчат, якія мяне падтрымалі. Мы адшукалі родных Метэхелі, узялі дазвол



Рукапіс верша «Генацвале».



Зборнік перакладаў вершаў Купалы на грузінскую мову.

Фота http://mamuli.by

ракладзеныя на грузінскую мову, яны ёсць у бібліятэках, — адзначае Марына Падгурская-Кутатэладзэ. — У 1940 годзе было адкрыццё музея Маякоўскага ў Багдадзі, Купала ездзіў туды. Наведваў манастыр у Гелаці. Разам з Шанідзэ (грузінскім пісьменнікам) ён аб'ездзіў амаль усю заходнюю Грузію, не кажучы ўжо пра ўсходнюю. Таму для асноўнай экспазіцыі створана банерная выстава — са шматлікімі фотаздымкамі беларускага песняра, аповедамі пра яго. Там падрабязна адлюстравана, што менавіта Купала наведваў у Грузіі і з якой нагоды. Гэту выставу мы плануем у красавіку прадставіць у музеі Маякоўскага ў Багдадзі. А ў верасні — паказаць яе ў Тбілісі.

Гаючыя ўласцівасці вады...

Цхалтуба вядомы сваімі радонавымі ваннамі. Іх вада лечыць 74 захворванні. Вельмі карысная яна для ўмацавання апорна-рухальнай сістэмы. Шмат мінералаў, якія ўтвараюць вельмі добрае спалучэнне. Там маецца нават выстава мыліц — людзі проста пакідалі іх, вяртаючыся дадому ўжо на сваіх нагах. Людзі расказваюць, што тутэйшыя воды дапамагаюць ім роўна на год — каб жыць без уколаў і лекаў, а затым яны зноў прыязджаюць да гэтых крыніц. Пятрусь Броўка таксама неяк пісаў, што ходзіць у Цхалтуба на ванны і гэта дапамагае яму.

У Цхалтуба можна ўбачыць пансіянат, у якім адпачываў Купала і дзе знаходзіўся медыцынскі персанал. Захаваўся будынак, абсталяваны каля 3-й крыніцы, да якой хадзіў паэт. Завітваў ён і на халоднае возера, якое можна ўбачыць і сёння.

Адметна, што вакол Цхалтуба шмат манастыроў. Побач рассцілаюцца горы. Можна ўбачыць і сталактытавыя пячоры... Усе адметнасці Заходняй Грузіі акурат сканцэнтраваны ў гэтым краі. Калі раптам надумаеце наведаць сонечную Грузію, падумайце над тым, каб пракласці свой маршрут праз Цхалтуба. Хто ведае, можа, і вам, як і Янку Купалу, пашанцуе сустрэць там сваю музу?..

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

Пантэон айчыны

УСЕВАЛАД (? — ?)

Гісторыя кожнага чалавека так ці інакш павучальная, толькі варта зрабіць з яе належныя высновы. Гэтак накопліваецца гістарычны вопыт пакаленняў, які дапамагае пазбегнуць былых памылак. У значнай ступені сказанае адносіцца і да князя Усевалада. Ягоны драматычны лёс вучыць нас даражыць свабодай і бараніць яе, у рэшце рэшт бараніць сваю краіну, каб не зрабіцца ў ёй чужынцам.

Усевалад быў князем удзельнага Герцыкскага княства, што знаходзілася ў Сярэднім Падзвінні і было ў васальнай залежнасці ад Полацка. Разам з полацкім князем Валадаром і кукейноскім князем Вячкам Усевалад змагаўся з крыжакамі, што на пачатку XIII стагоддзя пачалі заваёўваць Усходнюю Прыбалтыку. Рыжскі біскуп Альберт, які ўзначальваў крыжацкую экспансію, прызнаваўся, што «Герцыкскі кароль заўжды быў ворагам рыжан, змагаючыся з імі і не жадаючы заключыць мір». Для авалодання землямі летаў і латгалаў перш за ўсё трэба было захапіць Герцыке ці падначаліць ягонага князя. Восенню 1209 года Альберт сабраў раду і нагадаў на ёй «усё зло, прычыненае каралём Герцыке разам з летонамі гораду Рызе». Было вырашана заваяваць Герцыке. Біскуп, магістр крыжакоў сабралі ў сваё войска апалчэнні скароных ліваў і летаў. Процістаяць гэтаму полчышчу Усевалад не меў сілы. Крыжакі разбілі ягоную дружыну і захапілі Герцыке. Каб вярнуць горад і вызваліць з палону сям'ю, Усевалад прыехаў у Рыгу да біскупа. Альберт паабяцаў вярнуць Герцыке пры ўмове перадачы «каралеўства» ў вечны дар Рыжскаму біскупству і прызнання сябе васалам біскупа. Умовы былі цяжкімі і рабілі Усевалада цалкам залежным ад рыжскага біскупа, а там і ягоным памагатым. Але чаго не зробіш дзеля выратавання родных. Усевалад пайшоў на ахвяру, аддаў свабоду ўзамен на жыццё сваёй сям'і. Крок цяжкі, але неабходны ў яго безвыходным становішчы.

Пасля клятвы вернасці Усевалад атрымаў Герцыке, як пажалаванне біскупа ў леннае валоданне. Ён павінен быў даносіць біскупу пра «ўсе злыя задумы русінаў і літвінаў». Гэтую ганебную ролю Усевалад не выканаў. Ён не зміры ўся з варожай уладай. Як адзначыў хранікст Генрых Латвійскі, Усевалад часта ўзначальваў войскі літвінаў, усяляк дапамагаў ім, забяспечваў прадуктамі, перапраўляў іх цераз Дзвіну. Саюзныя адносіны з літвінамі зразумелыя, бо Усевалад быў жанаты з дачкой аднаго з моцных літоўскіх князёў Даўгерутэ. Усевалад разумеў, што паасобку спыніць крыжацкую экспансію цяжка. Даўгерутэ ездзіў у Ноўгарад і заключыў там саюз супраць крыжакоў. Па дарозе назад ён трапіў у крыжацкі палон, дзе і пакончыў з сабой. Усевалад пазбавіўся моцнага саюзніка і, па сутнасці, быў асуджаны на расправу, якая неўзабаве і адбылася ў 1214 годзе.

Крыжакі захапілі Герцыке і спалілі яго. Усевалад, які адсутнічаў у горадзе, вярнуўся на папялішча. Толькі не аднаўляць горад давялося, а змагацца з ворагам. Крыжакі зноў паўтарылі паход на Герцыке. Ёсць звесткі, што Усевалад загінуў, але новыя дакументы сведчаць аб іншым. Усевалад захаваў не толькі жыццё, але і свой горад, пэўна, адмовай ад барацьбы з крыжакамі, бо ён ужо не згадваецца ў «Хроніцы Лівоніі» як вораг Рыгі і Лівонскага Ордэна.

З дакументаў вядома, што ў 1224 годзе біскуп Альберт па просьбе Усевалада перадаў «палову замка Герцыке і ўсіх зямельных уладанняў, што адносяцца да гэтага замка» рыцару Конраду з Ікесколя, жанатаму з ягонай дачкой. Такім чынам, каб захаваць свой лен, Усевалад парадніўся са сваімі нядаўнімі ворагамі. Як кажуць, тут ужо не да прынцыпаў, абы выжыць. Такі выбар зрабіў

Усевалад, прыстасаваўся да ўмоваў, зжыўся з ворагам.

У 1230 годзе Усевалад перадаў частку свайго ўладання рыжскаму біскупству. Памёр Усевалад дзесьці напрыканцы 1230-х гадоў, бо з 1239 года Герцыке завалодаў рыжскі біскуп, які палову яго падараваў Ордэну, а другую палову прадалі спадкаемцы Усевалада. Новыя гаспадары Герцыке не аднавілі да жыцця Герцыке, горад неўзабаве заняпаў і да XIX стагоддзя дайшло толькі ягонае гарадзішча, якое ледзь адшукалі. Красамоўная гісторыя заняпаду і забыцця. Невядомы лёс спадкаемцаў Усевалада, куды раскідаў іх магутны вецер перамен. Невядома, якое дачыненне мае князь Гердзень, які заключыў у 1265 годзе ад імя Полацка дамову з Ордэнам і замкам з падобным імем Гердэне ў былым Герцыкскім княстве. Магчыма, Гердзень быў сынам Усевалада, тады мы маем працяг гісторыі герцыкскай дынастыі. Але тут мы ўваходзім у вобласць фантазіі, што само па сабе цікава. Зрэшты, гісторыя павінна быць цікавай, каб яна вабіла людзей, і таямнічай, каб новыя даследчыкі спрабавалі пранікнуць у яе таямніцы. Калі ўсё зразумела і відавочна, дык няма неабходнасці вывучаць, думаць, рабіць высновы і адкрываць тое, што хацелі сказаць ці перадаць нам продкі.

Вітаўт ЧАРОПКА.

■ Гасцёўня

«ЗАДАЧА ЛЮБОЙ СТАЛІЦЫ — ДЭМАНСТРАВАЦЬ»

Лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Сяргей Сергачоў пра традыцыі і сучаснасць у архітэктуры

Днямі Сяргей Сергачоў — загадчык кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў БНТУ, доктар архітэктуры, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі архітэктуры — атрымаў прэмію Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Пры вылучэнні для такой высокай адзнакі была звернута ўвага на яго кнігу «Народнае дойлідства Беларусі. Гісторыя і сучаснасць», праца над якой вялася адначасова з дзейнасцю па захаванні аб'ектаў народнага дойлідства, якія маюць гістарычную і мастацкую каштоўнасць. Сяргей Сергачоў адзначыў у інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды»:

— Найперш хачу падзякаваць вашай газеце. Бо калі выйшла мая кніга, менавіта «Звязда» першай змясціла інфармацыю пра яе. Пазней выйшлі разгорнутыя рэцэнзіі ў «Літаратуры і мастацтве», іншых выданнях, аднак менавіта вы адразу ацанілі вартасць выдання. Яно, дарэчы, добра прадаецца, распаўсюджваецца і рэкламуецца нават у Германіі і Амерыцы. Таму атрыманне прэміі Прэзідэнта — пацвярджэнне значнасці маёй кнігі, якая, я ўпэўнены, не страціць сваёй актуальнасці і праз 200 гадоў.

— У вашым выданні апісваецца беларускае дойлідства. Раскажыце, у чым яго адметнасць?

— Беларусы заўсёды ўлічвалі месца і час. Месца — значыць, прыродныя з'явы: мароз, завеі, колькасць сонца. Таксама бралі пад увагу ўмовы жыцця — тут заўсёды было шмат войнаў, гінулі людзі. Як асноўны матэрыял выкарыстоўвалі драўніну, якая хутка знішчалася пажарамі. Агонь часам забіраў па 300 дамоў запар. У летапісах ёсць звесткі, што, напрыклад, у Полацку, Дзісне за адну ноч згарэлі ўсе да аднаго дамы. І ўсё гэта трэба было хутка ўзнаўляць. Таму былі выпрацаваны зборныя метады будаўніцтва, якія дазвалялі абысціся меншымі затратамі часу, грошай, матэрыялаў, фізічнай сілы. З гэтай прычыны наша архітэктура сціплая і вельмі дакладная. Разлічвалі на колькасць людзей у сям'і, скаціны ў хляве — лішняга не будавалі. У суседніх народаў маглі на два паверхі ўзводзіць дамы, у нас жа так не рабілі, бо не было патрэбы. А летам увогуле разыходзіліся спаць хто куды — на сена ў пуню, у лазню, на гарышча. Узімку, натуральна, усе збіраліся ў хаце. Больш за тое, у маразы нават куры з пеўнікам пад печчу жылі, бо ў хляве было холадна. І парсючок тут жа, побач, хаваўся. Наша архітэктура на ўсё гэта рэагавала.

— Ці былі асаблівасці ў розных рэгіёнах Беларусі?

— Так, безумоўна. Узяць, напрыклад, Палессе і Віцебшчыну — там зусім розныя двары. На Палессі будавалі ў адзін шэраг, бо зямлі мелі няшмат, яе адусюль абступалі балоты. Таму такія паселішчы нават называліся «востравам». Насельніцтва прыбаўлялася, даводзілася дзяліць зямлю — узводзілася шчыльная забудова. Таму на Палессі такія вялікія вёскі.

У тым жа Моталі сёння 6000 жыхароў. А калі казаць пра Віцебшчыну, то зямлі там хапала, але было шмат узвышшаў, балоцін. Вялікіх палёў не мелася, таму і вёсачкі дробныя — 10—15 двароў. А 20 хацін — лічылася ўжо шмат. Калі паехаць на Падняпроўе ці Панямонне, можна ўбачыць, што там будавалі вянком — пасярэдзіне дом, а вакол яго гаспадарчыя пабудовы, усё гэта зачынялася прыгожай брамай. Такім чынам побыт сям'і быў схаваны ад старонняга вока. Калі прыйшла калектывізацыя, шмат што зрабілася непатрэбным — месца для каня, пуня для сена. Такая структура пачала знікаць. Дарэчы, цяпер зноў сталі патрэбны гараж, пэўная майстэрня — і людзі ўзнаўляюць гэту вянковую забудову. Цікава паехаць і ўбачыць сёння невялічкія вянкі-крэпасці, падобныя да тых, што былі 500 гадоў таму.

— Значыць, можна сказаць, што традыцыі будавання вяртаюцца?

— Яны заўсёды прысутнічалі ў нашым жыцці. І калі не было магчымасці іх увасобіць, людзі ўсё адно памяталі іх. Разуменне, як і што трэба рабіць, жыло ў свядомасці, нешта распавядалі дзяды. У сваёй кнізе я імкнуўся паказаць архітэктуру як частку культуры, у тым ліку духоўнай. Асяроддзе, у якім жылі людзі, ніхто для іх не рабіў. Яны ствараліі яго самі. Хлопчыкаў з маленства вучылі ўпраўляцца з інструментамі...

— У наш час многія беларусы з вёсак пераехалі ў гарады. Напрыклад, мае дзяды добра апрацоўвалі дрэва, а вось браты ўжо не так шчыльна ім займаюцца. Ці правільна сказаць, што мы нешта страцілі?

— Вядома ж, не, бо грамадства ідзе наперад. Многае застаецца ў пэўных легендах, паданнях і такім чынам жыве з намі. Ёсць такая адметнасць у беларусаў — мы заўсёды вельмі паважалі ўсё новае. Нават прымаўка такая ёсць: «Хоць альховы, абы новы». Бо альха — не надта добрая драўніна — але калі штосьці новае зробяць з яе, то гэта добра. Зараз мы імкнёмся да нечага лепшага. Таму шкадаваць пра тое, што нешта страцілі, не варта. Галоўнае тое, што ў народным дойлідстве не было глупства. Прыгажосць дадавалася толькі ў тых месцах, дзе гэта было патрэбна, а на лішняе не марнавалі час.

— Наколькі актуальнае сёння будаўніцтва з драўніны?

— Драўніна вяртаецца, апошнім часам будуецца шмат модульных дамоў. Іх робяць акурат так, як рабілі раней. Не заўсёды хату можна было ўзвесці на тым месцы, дзе яна будзе стаяць. Бо там яшчэ знаходзілася ранейшая хата, у ёй жылі, а ўжо патрэбна была іншая. Таму новы зруб збіралі ў іншым месцы, затым разбіралі. Старую хату прымалі, а на яе месцы складалі новы зруб. Тое ж сёння і з панэльнымі дамамі — іх дзесьці робяць, а пасля прывозяць. Модульныя дамы, іх шматслойны драўляны каркас робіцца па тым жа прынцыпе: рыхтуюць дзесьці ў іншым месцы, а затым за два-тры дні збіраюць новы дом там, дзе трэба.

— Вы кажаце, што нашы продкі будавалі мудра... Як ацэньваеце гарадскую архітэктуру, якая з'яўляецца ўжо ў наш час?

— Усё ўшчыльняецца — нічога іншага чакаць і не варта. Бо зямля ў горадзе каштуе дорага, кожны шукае вольнае месца, каб нешта пабудаваць. Аднак у Мінску праблема застаецца... Задача любой сталіцы свету, у адрозненне ад іншых гарадоў, дзе ўсё можа быць шчыльна забудавана, — нешта дэманстраваць, пакінуць сабе вольныя прасторы. Як Елісейскія палі ў Парыжы ці Цэнтральны парк у Нью-Ёрку (хоць гэта і не сталіца). А ў нас ёсць зялёны дыяметр вакол Свіслачы ў Мінску. Я назіраю, як то там, то там ад яго адразаюць кавалкі. Але добра было б гэту тэрыторыю не чапаць, каб былі бачныя рака і зеляніна. Гэта элемент сталічнасці — дазволіць сабе прадэманстраваць. А ў нас з гэтым здараюцца пэўныя праблемы.

«Летам разыходзіліся спаць хто куды — на сена ў пуню, у лазню, на гарышча. Узімку, натуральна, усе збіраліся ў хаце. Больш за тое, у маразы нават куры з пеўнікам пад печчу жылі. І парсючок тут жа, побач, хаваўся».

— Вы з'яўляецеся членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі архітэктуры. Ці можна параўнаць нашы збудаванні з тымі, што ўзводзяцца ў іншых краінах?

— Калі нават у інтэрнэце паглядзець, што адбываецца з архітэктурай, міжволі ўзнікае думка, а ці не тая гэта раскоша, што Рым згубіла?.. Архітэктары імкнуцца прадэманстраваць свае таленты. Інвестары ўкладаюць неймаверныя грошы ў будаўніцтва. Натуральна, з'яўляюцца аб'екты, якія дэманструюць паспяховасць пэўнай фірмы ці банка. Тое ж адбываецца і ў нас. Зроблены вельмі цікавыя пабудовы для спорту — не шмат дзе яшчэ ёсць такія, вельмі сучасныя. Адносна той жа Нацыянальнай бібліятэкі было столькі спрэчак — правільная форма абрана ці не? Аднак гэта да лепшага — спрэчкі робяць больш вядомымі горад, пабудову і прыцягваюць да яе ўвагу.

«Ёсць такая адметнасць у беларусаў — мы заўсёды вельмі паважалі ўсё новае. Нават прымаўка такая ёсць: «Хоць альховы, абы новы».

— Вы казалі пра парушэнні цэласнасці забудовы... Каля той жа Нацыянальнай бібліятэкі з'явіўся велізарны гандлёвы цэнтр, які не толькі сваімі памерамі, але і падсветкай канкурыруе з сімвалам сталіцы — «алмазам».

— Я называў гэты гіпермаркет «бюстгальтарам» — нечым падобны па форме. А наконт таго, што з'яўляецца вакол Нацыянальнай бібліятэкі, я неяк сказаў, што гэта горшыя ўзоры брутальна-бетонных варыянтаў. І фасады ў іх непрыгожыя, і надзвычай вялікая шчыльнасць забудоў. Падобна на казарменны мікрараён. Тое, што цяпер аўтамабільная стаянка для пакупнікоў крамы падбіраецца да самой бібліятэкі — таксама надзвычай дрэнна. Бо такому па грамадскай значнасці і па формах аб'екту трэба мець вакол сябе свабодную прастору. А не мітусню, плямы ад бензіну на асфальце, людзей з торбамі — гэта нядобра. Стаіць помнік Францыску Скарыну, а за яго спінай з багажніка ў багажнік перакладаюцца прадукты. Гэта акурат тое, што да сталіцы не павінна мець адносін, а можа адбывацца дзесьці звонку. Гэта вялікі наш пракол.

— Няўжо сапраўды грошы вырашаюць усё? Ці могуць паўплываць архітэктары і грамадскасць на прыняцце рашэнняў?

— Калі мы ідзём да рынкавых адносін, то там усё вельмі цвёрда: заказчык заўсёды правы, нічога з гэтым не зробіш. Я б таксама хацеў быць заказчыкам. У гэтым, дарэчы, праблема архітэктараў — яны ніколі не будуюць за свае грошы. Заўсёды за нечыя — і павінны з гэтым лічыцца.

— Вы шмат займаліся пытаннямі захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Наколькі, на вашу думку, бяспечнае ў яе становішча?

— Добра было б, каб мясцовыя ўлады захоўвалі тое, што ім дасталося. Як гэта зрабіць, я, па шчырасці, не ведаю. Але яшчэ больш мяне непакоіць тое, што шмат спадчыны, не ўнесенай у спіс каштоўнасцяў, і яна знікае. Аднак гэта пытанне стаіць ва ўсім свеце. Мне шкада, гады чатыры таму ў Ашмянах знеслі карчму — драўляную, якая месцілася ў цэнтры горада. Гэта быў бы адзіны прыклад класічнай карчмы, са стайнямі ўнутры. Аднак яе зруйнавалі... І такіх выпадкаў шмат. Тое ж і з Паўночным завулкам у Мінску, дамамі ў Гомелі, Магілёве, якія зносяцца. Трэба, каб улады і грамадства цвёрда сказалі: вось гэты куток мы захоўваем — штосьці зробім там цікавае, размесцім рамеснікаў, прывабім турыстаў — а ўсё астатняе захаваць немагчыма. Але, мне падабаецца, гэта нідзе не сказана, грамадства ўвесь час уздымаецца, калі нешта плануюць знесці.

— Яскравы прыклад дыскусій апошняга часу — сталічны раён Асмалоўка. А на вашу думку, ці яго варта захаваць?..

— Я ведаю гэта месца, яно мне надзвычай падабаецца. Аднак жыць там не надта добра — загазаваныя, шумныя вуліцы. А зрабіць у ім пэўны культурны цэнтр было б вельмі добра (пэўную частку дамоў, што далей ад вуліцы Багдановіча, можна пакінуць жылой). Як сведчанне ўзнаўлення Мінска пасля вайны гэта быў бы добры помнік — ён знаходзіцца ў цэнтры, зручна ўбачыць, з чаго пачыналі ў тыя часы. Гэта памятка і пра архітэктара Асмалоўскага, які ў свой час быў галоўным архітэктарам Мінска і шмат зрабіў для сталіцы. Я б шукаў шляхі для захавання Асмалоўкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ
о торгах

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1** – Автомобиль NISSAN VANETTE КАРГО, 1999 г/в, цвет красный, тип – легковой минивэн, гос. номер 5644АО-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова VSRDEVC23U0091599. Стоимость лота 3 450 руб. 00 коп. (Три тысячи четыреста пятьдесят белорусских рублей) **Лот №2** – Автомобиль NISSAN PATROL, 2004 г/в, цвет серебристый металлик, тип – легковой джип, гос. номер 1699АО-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) JN1TESY61U0142488. Стоимость лота 20 596 руб. 00 коп. (Двадцать тысяча пятьсот девяноста шесть белорусских рублей) **Лот №3** – Автомобиль УАЗ 390945-310, 2010 г/в, цвет темно-зеленый, тип – грузовой, бортовой, тентовый, гос. номер АЕ2976-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) 390940А0107880, 330360А0425888. Стоимость лота 3 081 руб. 00 коп. (Три тысячи восемьдесят один белорусский рубль) **Лот №4** – Автомобиль ГАЗ 3302, 1999 г/в, цвет светло-серый, тип – грузовой, бортовой, тентовый, гос. номер АА8921-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) 330200Х0032880, 330200Х1759175. Стоимость лота 2 208 руб. 00 коп. (Две тысячи двести восемь белорусских рублей) **Лот №5** – Автомобиль ВАЗ 2121, 1993 г/в, цвет темно-красный, тип – легковой специальный джип, гос. номер 4111АК-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) ХТА212100Р0993650. Стоимость лота 814 руб. 00 коп. (Восемьсот четырнадцать белорусских рублей)
Собственник (владелец) имущества	Зарегистрировано за унитарным предприятием областной коммунальной собственности «База отдыха «Крупенино» (УНП 300601277)
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение (адрес) имущества	г. Витебск, ул. В. Интернационалистов, 31 (автостоянка «Крупенино»)
Место (адрес), дата и время проведения торгов	03.02.2017 в 11.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by Судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич – тел./факс (80212) 614023 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович – тел. (80212) 614015
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 02.02.2017. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 23 февраля 2017 года
проводит 2-й открытый аукцион
по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел.руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
13	Автошасси МАЗ-5335 ш. 20300 дв. 748759 1986 г. *4 кат. 59 808 км* Кузов-фургон КМ-500 №б/н 1986 г. *4 кат.*	г. Ст. Дороги в/ч 48668	5 100,00	510,00
14	Автошасси МАЗ-5335 ш. 23241 дв. 780389 1986 г. *4 кат. 113 525 км* Кузов-фургон КМ-500 №б/н 1986 г. *4 кат.*	г. Ст. Дороги в/ч 48668	5 200,00	520,00
